# МАСТАЦТВА ДЭКАРАТАРАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Спадарыні, пакажыце, калі ласка, дзе тут засталіся старыя часткі, — звярнуўся я, калі ўсе выйшлі, да жанчын, якія працавалі з ляпнінай на рыштаваннях.

— Вунь там, бачыце, цёмны такі кавалак, і яшчэ во ў куце, — паказалі мне 20 сантыметраў у адным месцы і столькі ж у другім. І я схільны верыць гэтым жанчынам, бо адказвалі яны шчыра і без усялякай задняй думкі.




**Яшчэ вясной у Бальнай зале замка была старадаўняя ляпніна. Цяпер столь зашытая гіпсакардонам, а аўтэнтычны дэкор вярнуўся на месца ў нязначнай долі...**

Выбух эмоцыяў у высокай камісіі адбыўся ў замкавых пакоях, дзе будзе адчынены рэстаран. Там падчас працаў было зроблена сенсацыйнае адкрыццё — фрэскі XVIII-XIX стагоддзяў на сценах. Захаваліся яны не цалкам. І рэстаўратары ўжо паспелі дзе-нідзе «дамаляваць» кавалкі, якіх неставала.

— Што вы робіце!.. — не стрымаўся доктар архітэктуры, дэкан архітэктурнага факультэта БНТУ Армен Сардараў. — Вы ўсё псуеце! Каму будзе цікава пабачыць фрэскі, якія глядзяцца, як новыя?! Так нельга рабіць!.. Трэба закансерваваць тое, што ёсць — і так пакінуць!..

Армена Сяргеевіча падтрымаў старшыня камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама Віктар Нікіцін, іншыя сябры Рады.

— Тады прымаем рашэнне проста зараз спыніць працы і прадумаць гэты момант дэталёва, — падсумаваў дыскусію Павел Латушка. — Таксама варта падумаць, ці не наробіць шкоды гэтым фрэскам рэстаран, які тут будзе.

Рэч у тым, што для рэстарана ўжо ўсё падрыхтавана: зроблена вентыляцыя, закуплена абсталяванне. Як кампраміснае рашэнне прагучала прапанова не выкарыстоўваць гэтую залу штодня (бо рэстаран займае некалькі залаў), а паказваць яе турыстам і праводзіць тут толькі важныя дзяржаўныя прыёмы.

Вялікую дыскусію выклікала пытанне аб мэблі для аднаўленага замка.

— У Еўропе існуюць два падыходы, — распавёў Сяргей Друшчыц. — Напрыклад, у Францыі аднаўлены пэўны замак — і набытыя для яго гарнітуры гэтага перыяду. Аднак нават пані Эльжбета Радзівіл сказала нам: калі вы набудзеце гарнітур, які знаходзіўся на віле Радзівілаў на Міжземным моры — гэта будзе не Нясвіжскі замак... Іншы шлях — на падставе іканаграфічнага матэрыялу вырабіць мэблю нанава.

Аднак існуе і трэці шлях. Яго агучыў начальнік Упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Ігар Чарняўскі.

— Як распавядала шаноўная пані Эльжбета Радзівіл падчас ліпеньскага знаходжання ў Нясвіжы, яе бацька, князь Альбрэхт Радзівіл, рабіў наступным чынам. Купляў недзе ў Гданьску адно прыгожае дарагое крэсла (ён вельмі любіў Гданьскую мэблю), аддаваў свaім майстрам — і яны выраблялі для яго цэлы такі камплект.

Такі метад быў ухвалены многімі сябрамі Рады як кампрамісны. Бо ўсе разумеюць, што грошай на старадаўнюю мэблю з аўкцыёнаў (а трэба больш за 5 мільёнаў долараў) цяпер няма...

Доктар мастацтвазнаўца Надзея Высоцкая выказала меркаванне наконт верагодных спосабаў папаўнення замка экспанатамі.

— Па-першае, трэба максімальна выкарыстаць музейны фонд Беларусі. Трэба разумець, што ствараецца, пасутнасці, трэці нацыянальны музей — і гэта справа дзяржаўнай важнасці. Па-другое, трэба аднавіць дзейнасць мытнай камісіі — бо праз мяжу часам намагаюцца нелегальна перапраўляць сапраўдныя мастацкія шэдэўры. Некаторыя з іх могуць заняць месца ў замку. Па-трэцяе, трэба звярнуцца да касцёлаў і цэркваў — шмат дзе захоўваюцца свецкія старадаўнія рэчы, якія трапілі туды рознымі спосабамі. І, нарэшце, трэба актыўней працаваць з нясвіжцамі — я ведаю, што ў людзей у хатах захоўваецца шмат лыжак-відэльцаў з княжацкага стала...




**Чатырохсотгадовую абарончую сцяну закладаюць зверху сучаснай цэглай. На гэта звярнуў асаблівую ўвагу міністр культуры Павел Латушка.**

Іншым значным пытаннем стала аднаўленне замкавай капліцы. Сяргей Друшчыц паведаміў, што ў Кракаве ўдалося знайсці каштоўныя звесткі пра інтэр'еры капліцы: падрабязны інвентар рэчаў, якія былі там адразу пасля пабудовы. Гэтыя звесткі мусяць быць выкарыстаны цяпер. У капліцы будзе размешчаны арган.

— Даруйце, а як будзе выкарыстоўвацца капліца? — задала дарэчнае пытанне Надзея Высоцкая.

— У асноўным як канцэртная зала, экспазіцыйная зала для турыстаў, — адказаў дырэктар Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж» Валеры Сталярчук. — Але мы вядзём таксама перамовы з ксяндзом, каб часам ладзіць там службы.

На гэтай высокай нарадзе далі слова і карэспандэнту «Звязды». Рэч у тым, што я ўжо два гады займаюся зборам і апрацоўкай радзівілаўскіх фотаздымкаў, браў чынны ўдзел у падрыхтоўцы летняга візіту князёў Радзівілаў у Беларусь. Усе гады рэстаўрацыі я фіксаваў на фота, на маю думку, памылкі рэстаўратараў — ад знішчэння трохпавярховай галерэі да руйнавання скляпенняў XVI стагоддзя. Маё дваццаціхвіліннае выступленне, зразумела, было моцна раскрытыкаванае Сяргеем Друшчыцам. Маўляў, ты нічога не разумееш, не разбіраешся і ўвогуле дылетант. Так, дылетант, бо не маю адпаведнай адукацыі. Аднак пабачыў, што робіце вы, прафесіяналы. Каб зразумець, што нельга руйнаваць старое і замяняць новым, — не трэба быць вялікім рэстаўратарам.

— Я бачу, вы адвыклі ад крытыкі, — спыніў сварку міністр Павел Латушка. — Лічу, што крытыка карысная, бо дае розныя погляды на справу і дазваляе прымаць правільныя рашэнні. Нагадваю, што вельмі важным пры рэалізацыі працаў на падобных аб'ектах з'яўляецца навуковы нагляд, дакладнае размежаванне будаўнічых работ і рэстаўрацыі. Вельмі важна, каб падобныя аб'екты не пераўтвараліся ў выніку ў аб'екты XXI стагоддзя, а захавалі ў сабе рысы тых часоў, калі яны будаваліся.

У фінале пасяджэння міністр звярнуў увагу сяброў Рады на яшчэ адну хібу.

— Я перагледзеў пратаколы папярэдніх пасяджэнняў, — сказаў Павел Латушка. — Вы прымалі шмат рашэнняў. Але я не пабачыў, каб хоць раз было пракантралявана іх выкананне. Гляджу ў дакумент і бачу рашэнне максімальна захаваць старую бастыённую сцяну, а на месцы бачу нешта іншае...

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**
**Фота аўтара.**

# АШМЯНСКІЯ БРЭНДЫ ЎПЭЎНЕНА ЗАВАЁЎВАЮЦЬ ГУСТЫ ПАКУПНІКОЎ

**Быў некалі ў Ашмянах, па сутнасці, толькі адзін знакаміты брэнд – гэта брэнд добра вядомага ў краіне Ашмянскага мясакамбіната. На многія рынкі прабіліся ашмянскія мясаперапрацоўшчыкі, многім спажыўцам прыйшлася да густу іх прадукцыя, мноства медалёў самай высокай «пробы» ды шматлікіх дыпломаў звезлі ашмянцы з розных міжнародных выстаў ды конкурсаў...**








Важкі цяжар славы адчуваюць яны, і несці яго прыемна. Ды, напэўна, не зусім правільна несці гэты цяжар у поўнай адзіноце. Няйначай, гэтай логікай кіраваліся ў Ашмянах ды пачалі апошнім часам раскручваць яшчэ адзін брэнд — свайго сыраробнага завода. Прычым цалкам заслужана, прадукцыя сыраробнага завода таксама вартая самай высокай ацэнкі. А ўжо разам робяць два ашмянскія прадпрыемствы яшчэ большую славу свайму гораду.

Зусім нядаўна ў Гродне адбылася міжнародная выстава «Еўрарэгіён «Нёман-2009», на якой прысутнічалі са сваёй прадукцыяй і два названыя ашмянскія прадпрыемствы. Вельмі добра заўважылі гэту прысутнасць наведвальнікі выставы, і кола прыхільнікаў прадукцыі двух ашмянскіх прадпрыемстваў пашырылася яшчэ болей. А ў нас у выніку з'явілася добрая нагода расказаць пра іх на старонках нашай газеты.

*(Матэрыялы пра ашмянскія прадпрыемствы чытайце на 6-й стар.)*

**Зваротная сувязь**

## Абараніць сябе няпроста...

**У НУМАРЫ «Звязды» за 2 кастрычніка быў змешчаны артыкул «Пакараць — пакаралі. Але за што?» Коратка нагадаем, што ў газету паскардзілася сельская настаўніца, якую вырашылі пакараць, так бы мовіць, рублём за тое, што летам не знайшлося ахвотных прапалоць «школьныя» 20 сотак. Прычым дырэкцыя школы «адмінусавала» ўсе грошы, якія выплачваліся настаўніцы (а яна была замацаваная як адказная за вучэбна-доследны ўчастак), пачынаючы са студзеня гэтага года, а гэта, між іншым, 400 тысяч рублёў. Пасля ўмяшання Гомельскай абласной арганізацыі прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі незаконны загад быў адменены, і настаўніцы вярнулі ўсе грошы назад.**

«Дзякуй, што не пакінулі мой зварот без увагі, — піша настаўніца. — Напрыканцы жніўня старшыня нашай прафсаюзнай арганізацыі ездзіла на раённы прафсаюзны сход, дзе прадстаўнік Гомельскай абласной прафсаюзнай арганізацыі згадвала пра маю сітуацыю. Яна казала, добра, што настаўніца не звярнулася ў суд, бо суд адназначна стаў бы на яе бок». Сорамна прызнацца, што я, працуючы настаўніцай, нават не ведала дакладна, куды трэба звяртацца, каб сябе абараніць. Таксама прадстаўнік з вобласці сказала, што такія пытанні лепш вырашаць непасрэдна на месцы. Але я была практычна перакананая ў тым, што на месцы мне наўрад ці ўдасца дабіцца справядлівасці. А нядаўна я прачытала ў «Звяздзе» артыкул «І настаўнік , і маляр, і ў класе гаспадар», у якой агучваецца намер парламентарыяў зафіксаваць у Кодэксе аб адукацыі норму, згодна з якой прыцягваць педагагічных работнікаў для выканання абавязкаў, не прадугледжаных у калектыўным дагаворы, можна будзе толькі на ўмовах аплаты ці на іншых прымальных для зацікаўленых бакоў умовах у адпаведнасці з дзейным заканадаўствам. Адразу падумалася: «Няўжо так і будзе?» А, з іншага боку, менавіта так і павінна быць. І добра што ёсць «правільныя людзі», якія гэта разумеюць, аб гэтым гавораць услых і, спадзяюся, будуць увасабляць свае перакананні ў рэчаіснасць. Поспехаў Вам у Вашай рабоце. Ваша нязменная падпісчыца».




# Магілёўскія нявесты — прыгажуні і разумніцы

**У МАГІЛЁВЕ 15 кастрычніка адбыўся конкурс «Нявеста года». Яго арганізатарам выступіў Магілёўскі цэнтр культуры і вольнага часу.**

У фінале бралі ўдзел 8 дзяўчат. Усе яны — патэнцыйныя нявесты: адны маюць актуальных жаніхоў, а іншыя толькі ў пошуку. Аднак галоўны прыз у выглядзе сертыфіката на бясплатнае правядзенне вяселля, упэўнены ўдзельніцы конкурсу, спатрэбіцца абавязкова кожнай з іх. Лёс узнагародаў, дарэчы, вырашала журы ў цалкам мужчынскім складзе.

Нявесты два тыдні напружана, разам са спецыялістамі, рыхтаваліся выйсці на сцэну і дастойна прадэманстраваць свае здольнасці ў трох творчых конкурсах. У глядацкай зале Цэнтра культуры быў аншлаг.

У першым конкурсе пад назвай «Стрэлы Амура» дзяўчаты распавядалі (у тым ліку мовай танца і спеваў) пра знаёмства з каханым чалавекам і першую рамантычную сустрэчу.

Вялікую ўвагу выклікаў конкурс «Толькі для цябе» — дэфіле ў інтымным адзенні з магілёўскай крамы «Адам і Ева». Адна з удзельніц, напрыклад, была ў вобразе афіцыянткі, а іншая — медсястры. Каментары лішнія — гэта трэба было бачыць.

І нарэшце конкурс строяў нявесты: кожная дзяўчына абірала для сябе вобраз, і ў адпаведнасці з ім — сукенку і аксесуары.

У жорсткай канкурэнтнай барацьбе перамагла магіляўчанка Ірына Підгурская, якой падаравана тое самае бясплатнае вяселле. Залатой нявестай з адпаведным атрыманнем падвескі з золата стала Вольга Папкова, а Анастасію Брылёву назвалі Сярэбранай нявестай і падаравалі срэбны бранзалет.

**Алена КАЗЛОВА.**




Фота БЕЛТА.

**Зачапіла!**

## «БЕЛАРУСКІ» ПЕРАПІС

Не магу не выказаць свайго абурэння любімай газеце, якой, я добра ведаю, «баліць» за беларускую мову. Неаднаразова ў рэспубліканскіх СМІ напярэдадні перапісу гучала інфармацыя пра забеспячэнне ўсіх ахвотных перапіснымі лістамі на беларускай мове. Больш за тое, абяцалася, што перапісчыкі пройдуць спецыяльную падрыхтоўку для працы з беларускамоўнымі грамадзянамі. Аднак часта слова разыходзіцца са справай. Так здарылася і ў гэты раз.

Я вяртаюся дадому звычайна ўвечары, каля васьмі. Таму па парадзе перапісчыка, што быў у мяне падчас папярэдняга перапісу, на падліковы ўчастак № 6 г. Гродна за мяне прыйшла запоўніць перапісны ліст дачка. Але зрабіць гэта на беларускай мове, як я і прасіла, яна не змагла: такіх лістоў у памяшканні, дзе праходзіў перапіс, проста не аказалася. І гэта на ўчастку, які месціцца ў галоўным корпусе Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, што носіць імя класіка беларускай літаратуры, аднаго з бацькоў сучаснай беларускай літаратурнай мовы!

Дзіўная сітуацыя: у краіне Беларусь перапісныя лісты на мове тытульнага этнасу трэба вышукваць, як нейкі рарытэт!

**Юзэфа ВЯРШЫЛА.** *г. Гродна.*

## ВЫХАД У ПАЎНАЛЕЦЦЕ

**Чым запомніцца дзень нараджэння газеты «Культура» прасунутым чытачам?**

Сваё 18-годдзе штотыднёвік адзначае не толькі рэальна — нумарам, які выйдзе ў суботу, але і віртуальна. На гэтае свята запрошаны тыя, хто чытае газету ў інтэрнэце: іх чакае сюрпрыз — мадэрнізаваны сайт газеты і ўсёй Рэдакцыйна-выдавецкай установы «Культура і мастацтва».

Падарунак чытачы атрымалі не толькі ў выглядзе новага дызайну сайта. З гэтага тыдня па адрасе www.kimpress.by можна знайсці архіў «Культуры» за 2007-2009 гады, абноўленую стужку RSS і. Да канца тыдня абновіцца форум і пошукавая сістэма. Арыентавацца ў культуры стане прасцей.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

**Хакей. КХЛ**

# ТРЭЦЯЯ ЗАПАР — ВОСЬМЫЯ НА ЗАХАДЗЕ

**«ДАЎНО так не хваляваўся, у апошні раз, напэўна, падчас гульняў зборнай на чэмпіянаце свету! Ганаруся КАМАНДАЙ!!!», «Усіх з перамогай!!! Адзначу Хювенена і Мезіна!!!», «Наперад, Дынама!!», «Паказалі характар!», «Выдатны матч, лепшы з усіх, што давялося пабачыць!!», «ураааааааааааааааааааааа!» — каментары заўзятараў хакею пасля гульні «Дынама-Мінск» — «Спартак» кажуць за сябе. Але аб усім па парадку...**

Перабраўшыся цераз уральскія перашкоды з вынікам кандыдатаў у майстры спорту па альпінізме, мінская каманда вярнулася на родную пляцоўку Палаца спорту. Праўда, не абышлося без страт. Згуляўшы супраць «Трактара» і «Аўтамабіліста» з недалечанай траўмай, Рытчы яе толькі пагоршыў. Цяпер застаецца нашаму канадскаму Байрану толькі хутчэй папраўляцца і назіраць за гульнёй з поглядам іншага Байрана — Джорджа — які казаў, што гора — гэта настаўнік мудрых. У замену яму з глыбокіх салігорскіх шахтаў быў «падняты» Сяргей Задзяленаў, які забіваў шмат галоў у апошніх гульнях чэмпіянату Беларусі. У зваротным кірунку быў адпраўлены ўкраінец Шафарэнка. Штонебудзь казаць пра суперніка, здаецца, і не трэба. Якія б вынікі (а ў гэтым сезоне і яны даволі высокія) ні паказвалі «чырвона-белыя», маскоўскі «Спартак» — гэта заўсёды брэнд. Тое самае, як швейцарскія банкі і музыка «Beatles».

З самага пачатку брэндавая каманда пайшла наперад, спрабуючы «расціснуць» гаспадароў з першых хвілін. Хоць каманды гулялі ў роўных складах, часам складвалася ўражанне, што дынамаўцаў проста менш на пляцоўцы. Пры падтрымцы вялікай колькасці сваіх заўзятараў, якіх набралася на цэлы сектар, масквічы раз за разам вымушалі Мезіна паказваць усё тое, за што яго клічуць героем нацыі. Тут яшчэ выдаленне Пелтанена. Але за гэтыя два штрафныя кругі секунднай стрэлкі ў масквічоў абсалютна нічога не атрымалася. Магчыма, з-за гэтага нервы Цыбака і Рыбакова не вытрымалі, і з інтэрвалам у некалькі секундаў спартакаўцы адправіліся «адпачываць». Перавагу 5 на 3 гаспадары выкарысталі хутка і па-фінску эфектна — передача Пелтанена, гол Хювенена. Да таго, што Ханэс адкрывае лік — ужо пачынаеш з радасцю звыкацца. Абмяняўшыся яшчэ некалькі вострымі атакамі, каманды нарадзілі проста шэдэўральную шайбу. Выканаў Баранка. Асістэнты Заварухін і Каблукоў. У ролі гледачоў — абарона мінскай каманды.

Другі перыяд адзначыўся вялікай колькасцю выдаленняў, што яшчэ больш дапамагло выйсці на авансцэну галкіперам. Мезін і Кочнеў «цягнулі» ўсё, што ляцела ў іх бок. На 39-й хвіліне толькі пасля кідка Шэўца здавалася, што шайбе ну проста няма куды дзецца, акрамя сеткі спартакаўскіх варот, але Кочнеў неверагодным чынам выратаваў гасцей, праўда, атрымаўшы, на жаль, пры гэтым траўму. «Пах крыві» зрабіў свой унёсак ці штосьці іншае, але трэці перыяд ужо дынамаўцы распачалі з кавалерыйскага наскоку на суперніка. Сваю другую ў гульні шайбу арганізавалі фіны: зноў перадача Пелтанена, зноў гол Хювенена. Але не паспелі беларускія гледачы на трыбунах адсвяткаваць, як ужо «маскоўскі» сектар радасна ўскінуў рукі. 2:2 — і некаторыя ўжо пачалі чакаць авертайму. Толькі не дынамаўцы. Яны працягвалі гнуць сваю лінію, вымушаючы выдаляцца гасцей. І Мялешка адказаў на грубіянства па-свойму — пасля паса Шэўца закінуўшы трэцюю шайбу. Да канца гульні заставалася восем хвілін. Сцэнар канцоўкі быў звыклы, як сюжэт амерыканскага баевіка. «Спартак» усёй моцаю наваліўся на гаспадароў, але Мезін і кампанія выстаялі. Для поўнага набору не хапіла толькі шайбы ў пустыя вароты, але хто цяпер будзе аб гэтым сумаваць.




Фота БЕЛТА.

Гэтая гульня, на першы погляд, толькі адна з шэрагу іншых, была даволі значнай у праекцыі на турнірную табліцу. Сваёй перамогай «Дынама» яшчэ больш зацвердзіла свае віды на месца пад сонцам плей-оф. Вы, напэўна, заўважыце, якое плей-оф, усё толькі распачынаецца, але курыца па зярнятку дзяўбе. Хай жа гэтыя зярняткі будуць лепш месцам вышэйшым.

**Яўген ВАРАКСА.**

## ЗАО «Дельта Банк»

*220036, г. Минск, ул. Розы Люксембург, 95. Тел. 279 0 279*
*www.deltabank.by*

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2009 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2009 | 01.10.2008 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 3 386,4 | 205,4 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 8 081,0 | 1 284,1 |
| 4 | Ценные бумаги: | 1103 | — | — |
| | для торговли | 11031 | — | — |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | — | — |
| | в наличии для продажи | 11033 | — | — |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 34 573,4 | 29 414,1 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 59 852,2 | 89 506,3 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 703,4 | 703,2 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 9 357,2 | 11 382,1 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 4 293,8 | 3 160,5 |
| 10 | ИТОГО активы | 110 | 120 247,4 | 135 655,7 |
| 11 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | — | — |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 5 570,2 | 42 378,4 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 45 815,2 | 23 084,0 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | 1 881,1 | — |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 2 229,5 | 5 032,6 |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | 55 496,0 | 70 495,0 |
| 18 | **КАПИТАЛ** | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 64 000,0 | 64 000,0 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | — | — |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | 513,8 | 260,0 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 76,8 | 739,9 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 160,8 | 160,8 |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | 64 751,4 | 65 160,7 |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 120 247,4 | 135 655,7 |
| 26 | **ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ** | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 56 890,9 | 11 906,2 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 53 858,4 | 78 356,8 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 октября 2009 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2009 | 01.10.2008 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 8 649,7 | 4 603,8 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 4 354,1 | 1 454,3 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 4 295,6 | 3 149,5 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 19 749,7 | 19 575,9 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 300,4 | 127,1 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 19 449,3 | 19 448,8 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 389,8 | 1 671,9 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | — | |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | — | |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 602,8 | 225,0 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 5 597,1 | 4 261,1 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 24 529,5 | 27 322,9 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 4 182,8 | 265,1 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | 339,9 | 6,1 |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 76,8 | 712,2 |

**И.о. Председателя Правления** **А.В. Бабицкая**

**Главный бухгалтер** **С. И. Миркевич**

Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 27 от 01.09.2007 г. УНП 807000015



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**З** патэнцыяльнай прыёмнай маці — мінчанкай Святланай (па яе просьбе імёны зменены. — Н.Д.) мяне пазнаёміў, як гэта нярэдка здараецца, адзін з герояў ранейшай публікацыі. *У жанчыны няма ўласных дзяцей. Вось і вырашыла падзяліцца нерастрачанай цеплынёй з 11-гадовай Алёнай, якая з чатырох гадоў вымушана жыць сярод такіх жа пакінутых біялагічнымі бацькамі. Яшчэ вясной Святлана афарміла ўсе неабходныя дакументы і пачала забіраць дзяўчынку са школы-інтэрната на выхадныя.*

*— Паўгода таму была ўпэўнена, што ў выніку вазьму Алёну на выхаванне ў прыёмную сям'ю, — кажа Святлана. — Цяпер жа ў разгубленасці — як мне быць? Алёна вельмі дрэнна вучыцца, у чацвёртым класе не ведае нават табліцы множання. Баюся забіраць дзяўчынку з інтэрната, бо яе ў школе дзеці «заклююць». Знікнуць з яе жыцця, быццам бы нічога і не было, таксама не магу...*

*Непакоіць жанчыну і думка, што Алёна, якая падтрымлівае стасункі са сваімі роднымі, паўторыць лёс маці і 25-гадовай сястры. Трое дзяцей апошняй таксама вымушаны жыць у дзіцячым доме сярод чужых людзей.*

# СЯМ'Я ДЛЯ ДЗІЦЯЦІ, а не дзіця для сям'і

*Па каментарый «Звязда» звярнулася ў аддзел аховы дзяцінства камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама і Сацыяльна-педагагічную ўстанову ўпраўлення адукацыі адміністрацыі Партызанскага раёна горада Мінска.*

**«ПЕРШ ЧЫМ МЯНЯЦЬ ДЗІЦЯ, ТРЭБА ШМАТ ЧАГО ЗМЯНІЦЬ У САБЕ»**

— Многія спадзяюцца, што ім дадуць на выхаванне анёла, — кажа н**амеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Сацыяльна-педагагічнай установы ўпраўлення адукацыі адміністрацыі Партызанскага раёна горада Мінска Наталля ВОЙТКА.** — Паверце, у дзяцей, ад якіх адмовіліся бацькі, няма крылаў. Больш за тое, у іх за плячыма ўжо ёсць негатыўны досвед, які яны набылі ў неспрыяльнай сям'і. Адсюль павышаная трывожнасць, агрэсіўнасць, неадэкватная самаацэнка. Большасці з іх, па зразумелых прычынах, вучоба даецца са скрыпам. Але гэта не значыць, што яны не могуць вучыцца ў агульнаадукацыйных школах. Практыка паказвае, што на першым часе ім, як і любому навічку, складана, але з цягам часу пры падтрымцы педагогаў і блізкіх людзей яны ўліваюцца ў калектыў. Галоўнае, паспрабаваць паставіць сябе на месца дзіцяці і своечасова падтрымаць яго, а ні ў якім разе не папракаць, паказваючы на недахопы.

Яшчэ вельмі важна, перш чым узяць на сябе адказнасць за лёс прыёмных дзяцей, раз і назаўсёды пазбавіцца ад стэрэатыпу, што яны абавязкова паўтораць памылку сваіх біялагічных бацькоў. Ёсць шмат канкрэтных прыкладаў, калі «кінутыя» дзеці не толькі становяцца выдатнымі бацькамі для ўласных дзяцей, але і ўсынаўляюць чужых. Атрымаецца разарваць «заганнае кола» ці не — залежыць ад таго чалавека, які займаецца выхаваннем, ад яго жадання, цярпення і ведаў. Я лічу, што нават самае складанае дзіця можна выхаваць, вывучыць і падрыхтаваць да самастойнага жыцця, калі пастаўлена менавіта такая мэта, а не якаянебудзь іншая.

**СТО РАЗОЎ АДМЕРАЙ, АДЗІН РАЗ АДРЭЖ**

Прыёмная маці — гэта нялёгкая праца, якая патрабуе поўнай аддачы, — кажа Наталля Войтка. — Працаваць давядзецца не толькі з самім дзіцем, але і, па неабходнасці, і з яго біялагічнымі бацькамі, якія па розных прычынах цяпер не могуць займацца яго выхаваннем. Некаторыя прыёмныя бацькі спрабуюць прысвоіць сабе дзіця, забараняючы падтрымліваць сувязі з кроўнымі роднымі. Гэтага ні ў якім разе нельга рабіць, бо дзеці бязмерна любяць сваіх непуцёвых бацькоў. А задача выхавальніка — рэабілітаваць, а не наносіць новыя псіхалагічныя траўмы.

— Мы зацікаўленыя ў тым, каб аддаць дзяцей у надзейныя рукі, — адзначае **начальнік аддзела аховы дзяцінства камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Зінаіда ВАРАБ'ЁВА.** — У сувязі з гэтым да прыёмных бацькоў прад'яўляюцца высокія патрабаванні. Пры прыёме на працу перавага аддаецца людзям з педагагічнай ці медыцынскай адукацыяй, поўным парам, якія маюць станоўчы досвед у выхаванні сваіх дзяцей. Немалаважна таксама, каб чалавек валодаў хоць бы элементарнымі ведамі па педагогіцы, псіхалогіі, медыцыне, дэфекталогіі. Таму ўсе прэтэндэнты, без выключэння, павінны атрымаць акадэмічную падрыхтоўку і толькі пасля браць на выхаванне дзяцей. Для гэтага Мінскі дзяржаўны інстытут развіцця адукацыі ладзіць для патэнцыяльных прыёмных бацькоў двухтыднёвыя адукацыйныя курсы. Акрамя таго, на базе сацыяльна-педагагічных устаноў ёсць аддзелы па рабоце з замяшчальнымі сем'ямі. Здараецца, што ў працэсе інфарматыўных і псіхалагічных заняткаў патэнцыяльная прыёмная сям'я ўсведамляе, што не гатовая да такой адказнасці. І добра, калі гэта разуменне прыйшло своечасова, пакуль дзіцяці не была нанесена чарговая траўма. Бывае і так, што людзі спачатку забяруць дзіця, а пасля, нацешыўшыся, вяртаюць назад. Маўляў, хацелася «мяккага і пушыстага», але чаканні не апраўдаліся. Вось чаму некаторыя дырэктары дзіцячых дамоў, апёкшыся, насцярожана ставяцца да людзей, якія прыходзяць, каб забраць дзяцей нават на выхадныя.

Сёння ў Мінску створаны добрыя ўмовы пражывання для сірот. Але дзіцячы дом ці школа-інтэрнат, зразумела, ніколі не заменяць сямейных узаемаадносінаў. Таму мы ад душы радуемся за кожнага хлопчыка і дзяўчынку, якім пашчасціла трапіць у прыёмную сям'ю. Цяпер у Мінску функцыянуе 214 прыёмных сем'яў, якія выхоўваюць ад аднаго да чатырох дзяцей. Прыярытэтнай жа формай уладкавання дзяцей-сірот па-ранейшаму застаецца ўсынаўленне. Сёлета мінчане ўжо ўсынавілі 47 дзяцей. Гэта больш, чым за ўвесь 2007 год. Пры гэтым праяўляюць жаданне папоўніць сям'ю не толькі бяздзетныя сем'і, але і людзі, якія маюць сваіх уласных дзяцей. Змянілася стаўленне і адносна ўзросту дзіця. Калі раней прасілі толькі грудных, то цяпер з задавальненнем прымаюць у сваю сям'ю і больш дарослых дзетак. Ёсць прыклады, калі грамадзяне наведваюць у дзіцячым доме аднаго дзіця, а ўсынаўляюць траіх.

...

**Прыёмная сям'я — гэта СЯМ'Я ДЛЯ ДЗІЦЯЦІ, а не дзіця для сям'і. Таму інтарэсы дзяцей прыёмныя бацькі павінны ставіць на першае месца. Што ж датычыцца дрэнных адзнак у школе, то... Галоўнае ж, як мне падаецца, не падрыхтаваць дзіця да паступлення ва ўніверсітэт, а выхаваць яго добрым чалавекам, сапраўднымі маці ці бацькам, якія ніколі не пакінуць родных дзяцей.**

**Надзея ДРЫЛА.**

Навука вучыцца

# ШКОЛЬНЫЯ ПЕРАГРУЗКІ: парады школьнікам і іх бацькам

Прагрэс дайшоў да таго, што школьнікі, нават зусім не старэйшыя, маюць працоўны дзень цалкам дарослай працяглрасці. Першая змена пачынаецца звычайна а 8-й гадзіне, 6 урокаў завяршаюцца каля 14-й, пасля абеду для многіх шкаляроў пачынаецца другая змена — школьныя факультатывы, заняткі ў музычных і мастацкіх школах, спартыўных секцыях і гуртках па інтарэсах...



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Карацей, вучань выходзіць у школу разам з дарослымі, якія ідуць на працу, і вяртацца можа акурат разам з імі, пасля 17-й. Толькі, у адрозненне ад бацькоў, пасля вячэры школьніку даводзіцца садзіцца за пісьмовы стол і выконваць хатнія заданні. Так, можа, адбываецца і не 5 дзён на тыдзень, але ўсё адно цяжка. За заняткамі не бачна звычайнага дзяцінства: мала застаецца часу на дваровыя гульні і забавы, не хапае сілаў на чытанне кніжак, стомленыя вочы і розум здольныя ўвечары толькі тупа глядзець у тэлеэкран...

Акрамя гэтага, школьныя перагрузкі датычацца і бацькоў. Не толькі клопатамі аб здароўі дзяцей, але і таксама штодзённымі хатнімі заданнямі. Дарослыя вяртаюцца дадому пасля паўнавартаснага 8-гадзіннага працоўнага дня, і пасля вячэры, аказваецца, трэба не расслабляцца і не адпачываць, а дапамагаць любімаму дзіцятку з урокамі. Бацькі школьнікаў добра ведаюць: гэта не самая простая работа. Натуральна, яе даводзіцца рабіць не ўсім, але, пагадзіцеся, многім з нас.

Што тут можна параіць? Радыкальныя парады наконт скарачэння хатніх заданняў у школе наўрад ці задаволяць настаўнікаў, а на скасаванне заняткаў па інтарэсах, якія развіваюць творчыя здольнасці дзяцей, наўрад ці пагодзяцца бацькі.

Таму парады, як правільна вучыцца і спраўляцца з перагрузкамі, сёння даюць школьнікам і іх бацькам на старонках «Звязды» медык, педагог-псіхолаг і народная лекарка. Чытайце, выбірайце, укараняйце!

## Сон, рух, харчы і вада

**Тацццяна КАНЯЕВА, загадчыца педыятрычнага аддзялення філіяла-паліклінікі № 10 г. Магілёва.**

**1. Здаровы лад жыцця** павінен стаць звычайнай справай. Трэба задоўга да школы вучыць дзяцей здароваму ладу жыцця гэтак жа сама, як іх вучаць гаварыць, чытаць, пісаць і лічыць. Вельмі важная атмасфера ўзаемаразумення ў сям'і і адмова бацькоў ад шкодных звычак.

**2. Паўнавартасны сон** трэба забяспечыць у першую чаргу. Малодшыя школьнікі павінны спаць не меней за 10 гадзін, старэйшыя — не меней за 7-8 гадзін. Хранічнае недасыпанне, актуальнае для старэйшых школьнікаў, вядзе да неўрозаў. Такія станы мы, медыкі, цяпер назіраем у школьнікаў ад 9-га класа.

**3. Паўнавартаснае харчаванне.** У выніку перагрузак у дзяцей назіраюцца два станы. У адных павялічваецца артэрыяльны ціск, з'яўляюцца галаўны боль і павышаная ўзбуджальнасць. Такім дзецям рэкамендуюцца харчы, багатыя на магній і калій. Гэта крупы, бабы, свежая зеляніна, морква, яблыкі, курага і чарнасліў. Трэба выключыць з рацыёну вострыя стравы, моцны чай, каву і шакалад.

Дзецям, у якіх, наадварот, памяншаецца артэрыяльны ціск, з'яўляюцца слабасць і вяласць, трэба ўжываць харчы, багатыя на кальцый: малочныя прадукты, тварог, сыр, рыбу.

**4. Барацьба з гіпадынаміяй.** Школьніку патрэбны штодзённы шпацыр на свежым паветры, а таксама рухальныя практыкаванні і працэдуры загартоўвання. Не трэба ківаць на школьныя ўрокі фізічнай культуры: яны «важаць» толькі 10-11 % у руху дзіцяці, якому патрэбныя таксама і ранішняя гімнастыка, заняткі спортам, танцы і іншыя. Акрамя гэтага, рух — гэта барацьба са стрэсам.

**5. Псіхаэмацыйнае напружанне.** назіраецца ў школьнікаў і ў старэйшых класах, і ў малодшых. Гэта залежыць і ад характару: адзін спакойны, іншы ўражлівы. Вельмі добра стрэс здымаюць водныя працэдуры. Добра, калі школьнік можа наведваць два разы на тыдзень басейн. Але калі такой магчымасці няма, то трэба карыстацца ўласнымі ваннай і душам.

Ніколі не паверу, што не хапае часу на кантрастны душ. Чаргаванне гарачай і халоднай вады доўжыцца ўсяго 4 хвіліны! Аднак гэта ўзмацняе кровазварот, стымулюе выкід актыўных рэчываў, якія дапамагаюць змагацца са стрэсавымі сітуацыямі. Лепей за ўсё рабіць кантрасны душ, калі дзіця вярнулася са школы стомленым і раздражнёным. Гэта будзе зарад бадзёрасці.

На ноч прапануйце школьнікам ванну для расслаблення — хваёва-салёную, хларыдную. Гучыць мудрагеліста, але размова ідзе пра дабаўленне ў ваду звычайнай солі. Калі ёсць час, заварыце зёлкі альбо хваіны.

**6. Музыкатэрапія** — проста і эфектыўна. Музыку трэба прывучаць слухаць з маленства. Размова не ідзе пра навушнікі круглы дзень, як цяпер усе робяць. Як доктар скажу, што гэта вельмі небяспечна — затыкаць вушы на вуліцы. Чалавеку дадзены слых для таго, каб своечасова арыентавацца ў сітуацыі і сыходзіць ад небяспекі.

Можна слухаць дома лёгкую нягучную музыку для расслаблення: такую, якая была б прыемна самому дзіцяці, але ўсё ж не манатонныя гукі.

**7. Вітамінна-мінеральныя комплексы.** Мікраэлементы дапамогуць школьніку ў барацьбе са стрэсамі. Аднак набываць комплекс вітамінаў і мінералаў у аптэцы лепей паводле рэкамендацыі вашага доктара.

Можна ўжываць і карысныя прадукты харчавання. Напрыклад, чарніцы для вачэй. Альбо мёд, які здымае стомленасць, супакойвае нервовую сістэму, нармалізуе сон.

**8. Пра камп'ютар** на заканчэнне проста не магу не сказаць. Ён, зразумела, палягчае жыццё чалавеку, але шкодзіць нашаму здароўю. Гэта ведаюць усе. А я проста нагадаю, што трэба выконваць мінімальныя патрабаванні, каб нівеляваць шкоду.

Працягласць працы за камп'ютарам: для малодшага школьніка — не больш за 15 хвілін, для вучняў 5-7 класаў — 30 хвілін, 8-11 класаў — не болей за гадзіну. Памятайце, што гэта не толькі нагрузка на вочы, але і на нервовую сістэму. Таму гуляць у камп'ютарныя гульні альбо працаваць за камп'ютарам на ноч — асабліва шкодна!

## Слухайце дзяцей!

— Па-першае, маці і бацька ніколі не павінны спяшацца альбо адцягваць увагу, калі дзіця ім нешта расказвае, — **лічыць галоўным правілам стасункаў з дзецьмі вядомая народная лекарка з Бялыніччыны Фядора КАНЮХАВА**. — Моўчкі і ўважліва выслухаць. Не перабіваць — гэта нібыта нож у сэрца дзіцяці. Яму трэба казаць свабодна і да канца выказацца. А ўжо потым бацькі могуць пытацца...

Не дзеці адразу павінны слухаць бацькоў, а ўперад бацькі павінны слухаць дзяцей. А потым даваць адказы на іх пытанні.

***— Можа, ёсць нейкія прыёмы, якія дапамагаюць дзецям добра вучыцца?***

— Адзін такі прыём укараніла ў сваёй працы мая знаёмая настаўніца з Расіі. Я ёй параіла рабіць наступным чынам: калі настаўнік уваходзіць у клас, ён пяць хвілін на ўроку аддае на правільную пасадку дзяцей.

Малыя павінны сесці за парты: пальцы ног паставіць на падлогу, а пяткі прыўзняць. Чаму? Пяткам трэба даваць адпачынак, там знаходзіцца важнае «сонечнае спляценне» чалавечага арганізма. А пальцамі, гавораць, увесь свет возьмеш. Рукі трэба пакласці на парту роўна, але не так, як звычайна вучаць у школе — руку на руку. А выцягнуць рукі уперад.

Вось такім чынам дзеці павінны пасядзець спакойна, нікуды не варочацца. Ад гэтай позы кровазварот наладжваецца, сасуды пашыраюцца. Тады і вучыцца школьнікі будуць інакш, лепей за іншых.

***— Няўжо такі просты прыём можа паўплываць?***

— Так. Іншы прыклад прывяду з ежай. Калі рабіць разумна, то ежу трэба накладаць альбо наліваць у адну вялікую пасудзіну, а потым кожны сваёй рукой павінен браць сабе порцыю. У тым ліку і дзіця: столькі, колькі сам хоча з'есці. Таму што ў той талерцы будуць толькі яго энергетычныя палі. Калі яму налівае суп маці, то ў талерку ідзе яе энергетычнае выпраменьванне: не толькі дабрыня да свайго дзіцяці, але трывогі дня і жыццёвыя праблемы. Няхай ежу накладае само дзіця — будзе больш здаровым.

***— Калі вучань прыйшоў са школы дадому...***

— ...трэба спачатку даць яму адпачыць. Трэба пакарміць, але пасля гэтага не адразу прыступаць да ўрокаў, а вольна паляжаць. Я гэта бачыла яшчэ ў дзяцінстве да вайны ў адной інтэлігентнай сям'і: пасля абеду посуд не мыюць, а ўсе кладуцца літаральна на 10—15 хвілін адпачываць. Калі адпачылі — тады кожны за сваю працу. Ад гэтага вялікая карысць арганізму: ежа правільна праходзіць і засвойваецца.

***— Цяпер усе набываюць дарагія вітаміны, каб падтрымаць дзяцей у іх цяжкай барацьбе за добрыя веды.***

— Я аддала б перавагу тым вітамінам, якія бацькі самі вырасцілі на градцы. Вось гэта сапраўдныя вітаміны! У набытых хімічных вітамінах — гэта яшчэ пытанне, што туды пакладзена. А калі на сваім лецішчы вырасціў агародніну і садавіну — гэта найлепшы вітамін.

І, безумоўна, добра збіраць лекавыя зёлкі. Прычым лепей зноў-такі збіраць сваімі рукамі, каб там было тваё энергетычнае поле.

***— А якія б зёлкі вы параілі?***

— Самая карысная — багародская трава. Потым яшчэ шыпшына і чыстацел. Гэтыя зёлкі я нават у сне бачыла, што яны вельмі карысныя для чалавека. Я таксама нарыхтоўваю трыпутнік, які можна ўзімку есці як шчаўе і класці патроху ў любую ежу.

***— Што б вы параілі бацькам, якія хочуць падтрымаць сваіх дзяцей-школьнікаў?***

— На мой погляд, трэба меней глядзець тэлевізар. Прычым і дарослым, і дзецям. Я ўключала б яго толькі на паўгадзіны, і досыць. Таму што пакуль дзіця глядзела тэлепраграмы — мазгі забіліся зусім іншым, і тады вучыцца не хочацца. Акрамя гэтага, дзіця стамляецца, пакуль глядзіць тэлевізар. Для навукі патрэбны свабодныя мазгі.

Я разумею, што школьнікам нагрузкі вялікія, і іх бацькам цяжка. Шчыра кажучы, пакуль маці прыйшла з працы, ежу прыгатавала, па гаспадарцы нешта зрабіла, то і дзіця няма сілаў і часу даглядаць. Жонка, несумненна, павінна быць дома, хатняй гаспадыняй. Але не заўсёды так атрымліваецца, і трэба маці і бацьку ўсё ж імкнуцца глядзець дзіця, слухаць яго і дапамагаць.

Дзецям раю, каб яны слухаліся бацькоў і былі да іх уважлівыя. Але я ведаю добра: які куст, такі і адростак. Што каму Богам дадзена — так і будзе.

## Правілы жыцця школьніка

**Алена ЛАЎРЭНАВА, магілёўскі педагог-псіхолаг:**

— **Самая галоўная задача бацькоў** — не ціснуць на дзяцей, а падтрымліваць іх. Лашчыць і гладзіць па галаве. Нават падлеткаў, якія дэманструюць вонкавую незалежнасць ад бацькоў. Але ўсе нашы дзеці маюць патрэбу ў падтрымцы і адчуванні, што ў іх вераць.

Я дам **стандартныя парады школьнікам і іх бацькам**. Пра гэта настаўнікі кажуць на кожным бацькоўскім сходзе: калі робіце хатнія заданні — абавязкова патрэбны перапынкі паміж урокамі, неабходна мяняць віды дзейнасці — пасядзеў, пабегаў.

Трэба **наладзіць рэжым дня:** ён павінен быць жорсткім у першую чаргу ў малодшых школьнікаў. У старшых класах падлетак павінен мець, з аднаго боку, час і грошы для забаў, але разам з тым і строгія абавязкі, якія датычацца заняткаў. Большасць з іх, якія разумеюць значэнне адукацыі ў жыцці чалавека, самі дысцыплінавана выконваюць усе ўрокі.

**Нельга рабіць урокі пасля 21-й гадзіны:** у такі час не кожны дарослы чалавек здолее прыгожа і граматна пісаць. І нават ужо пасля 20 гадзін каэфіцыент карыснага дзеяння, асабліва ў малодшых школьнікаў, рэзка памяншаецца. Проста не варта трымаць за пісьмовым сталом дзіця ў позні час: карысці не будзе ні яму, ні школе.

Для добрага фізічнага стану і здаровай псіхікі вялікае значэнне маюць таксама **нармальнае 4-разовае харчаванне і ўжыванне вітаміннай садавіны**.

**Калі дзіця прыносіць дрэнную адзнаку са школы**, нельга лаяцца на яго: маўляў, ты — дрэнны. Не, ён — добры, а вось яго ўчынак (не вывучыў урок, прагуляў, займаўся чымсьці іншым) — дрэнны, і трэба выправіць становішча.

Бацькі павінны цікавіцца, чаму дзіця атрымала дрэнную адзнаку. Калі не вывучыў урок — гэта адна праблема, а калі вывучыў, але не зразумела настаўніца альбо задражнілі аднакласнікі, то гэта патрабуе зусім іншых дзеянняў. **Трэба быць пільнымі, бацькі!**

**Крычаць нельга.** Вы дарослыя людзі: тармазіце сябе, не дазваляйце сабе выліваць агрэсію на дзяцей. Гэта, акрамя ўсяго іншага, дрэнны ўзор выхавання.

Нельга пастаянна трымаць дзіця ў такім актыўным выхаваўча-навучальным тэмпе, што ў яго не застаецца часу на вольныя забавы. **Калі школьнік дрэнна спіць уначы і дрэнна есць,** то, значыць, ён адчувае вялікія перагрузкі, фізічныя і псіхічныя. Можа ўзнікнуць **дэпрэсіўны стан**. Таму як толькі дзіця стала дрэнна спаць і есці, адразу трэба бегчы да спецыяліста, доктара. Увогуле калі дзіця кажа, што стамілася і сілаў проста няма, і гэтак цягнецца тыдні два, то трэба пераглядзець яго распарадак і разгрузіць.

**Камп'ютар і тэлевізар** — гэта ўвогуле асобная тэма. Дзеці завісаюць гадзінамі перад экранамі і маніторамі. Гэта дрэнна ўплывае не толькі на зрок, але і на здольнасць кантактаваць у рэальным свеце, бо ён жа адрозніваецца ад віртуальнага.

Я дазваляю сваім дзецям гуляць у **камп'ютарныя гульні** толькі ў маёй прысутнасці: малодшым — **15—20 хвілін на дзень, старэйшым — да гадзіны**. Што датычыцца тэлевізара, то асабіста я рэгулявала б не столькі час, колькі праграмы для прагляду. Але калі школьнік не выконвае свае абавязковыя заданні, трэба жорстка абмяжоўваць час прагляду тэлевізара.

**Падрыхтавала Ілона ІВАНОВА.**

**Лекарка:** *«Бацькі ўперад павінны слухаць дзяцей: не спяшацца, не адцягваць увагу, а слухаць уважліва, не перабіваць, а потым адказаць на іх пытанні».*

**Медык:** *«Вада — лепшы сродак барацьбы са стрэсам. Зразумела, паход у басейн патрабуе часу. Але ніколі не паверу, што не хапае часу на кантрасны душ. Чаргаванне гарачай і халоднай вады доўжыцца ўсяго 4 хвіліны! Калі дзіця вярнулася са школы стомленым і раздражнёным, кантрасны душ — лепшы лек».*

**Псіхолаг:** *«Самая галоўная задача бацькоў — не ціснуць на дзяцей, а падтрымліваць іх. Яны павінны адчуваць, што ў іх вераць».*


## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ПРОЕКТИРОВАНИЯ И СТРОИТЕЛЬСТВА В г. ГРОДНО

| | | |
|---|---|---|
| 1. | **Наименование объекта** | **Право проектирования и строительства комплексной автозаправочной станции на земельном участке площадью 0,7441 га** |
| 2. | **Местонахождение объекта** | г. Гродно, ул. Суворова |
| 3. | **Капитальные строения, подлежащие сносу, ориентировочный размер убытков** | Здание весовой стоимостью 45 556 500 руб., здание мастерских стоимостью 63 226 900 руб., здание проходной № 3 стоимостью 7 730 800 руб., площадка для складирования песка стоимостью 650 153 580 руб., ограждение из ж/б плит стоимостью 14 578 180 руб., ограждение из металлической сетки стоимостью 11 608 713 руб., ворота деревянные стоимостью 762 516 руб., сети электроснабжения стоимостью 5 572 082 руб. |
| 4. | **Условие сноса** | Компенсация стоимости сносимых зданий и сооружений в соответствии с действующим законодательством |
| 5. | **Срок аренды земельного участка** | 25 лет |
| 6. | **Условия продажи** | Строительство в течение 2-х лет комплексной автозаправочной станции с обоснованием уменьшения границ санитарно-защитной зоны при проектировании |
| 7. | **Сведения об инженерных коммуникациях** | Информацию можно получить в ГП «Гродненский центр недвижимости» по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, каб. 57 |
| 8. | **Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории** | Информацию можно получить в ГП «Гродненский центр недвижимости» по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, каб. 57 |
| 9. | **Начальная цена продажи** | 368 800 000 рублей |
| 10. | **Размер задатка** | 36 880 000 рублей |
| 11. | **Сумма возмещения расходов, связанная с проведением аукциона** | 9 507 380 рублей |

**Принимать участие в аукционе могут только юридические лица и индивидуальные предприниматели.**

Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления желающие принять участие в аукционе представляют:

1) Копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет 3012000006896 в фил. 426 АСБ «Беларусбанк», код 199, УНП 590727594 получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

**Юридические лица:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда данное юридическое лицо представляет его руководитель), копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации.

**Индивидуальные предприниматели:** паспорт и копию свидетельства о государственной регистрации, а в случае участия в аукционе представителя индивидуального предпринимателя – документ, удостоверяющий личность и нотариально заверенную доверенность.

2) Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения Гродненского горисполкома об изъятии и предоставлении земельного участка обязан внести плату за право заключения договора аренды земельного участка возместить расходы, связанные с проведением аукциона и подготовкой документации для его проведения, а также выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии и предоставлении земельного участка. После совершения указанных действий, но не позднее 2 рабочих дней, городской исполнительный комитет заключает с победителем аукциона договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) и договор аренды земельного участка. **Аукцион состоится 17 ноября 2009 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2.** Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2, каб. № 57 в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Заявления принимаются с 19 октября по 11 ноября 2009 г. Телефоны для справок в Гродно: (0152) 720546. Адрес сайта: **www.gorod.grodno.by**.

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. ГРОДНО

| Лот № | наименование объекта | местонахождение объекта | площадь земельного участка (га) | кадастровый номер | начальная цена (руб.) | сумма задатка (руб.) | форма проводимого аукциона | условие продажи объекта | сумма возмещения расходов, связанная с проведением аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Право аренды земельного участка сроком на 50 лет | ул. Суворова, У-258 | 0,3496 | 440100000001004877 | 50 000 000 | 5 000 000 | Аукцион с условием | Строительство в течение 2-х лет объекта промышленного назначения по переработке сельскохозяйственной продукции* | 4 493 340 руб. |
| 2. | Право аренды земельного участка сроком на 50 лет | пр-т Клецкова, У-55 | 0,3793 | 440100000001004878 | 379 000 000 | 37 900 000 | Аукцион с условием | Строительство в течение 2-х лет автозаправочной станции с обоснованием уменьшения границ санитарно-защитной зоны при проектировании* | 4 751 550 руб. |
| 3. | Право аренды земельного участка сроком на 25 лет | ул. Пучкова | 0,2700 | 440100000001002920 | 152 700 000 | 15 270 000 | Аукцион с условием | Строительство в течение 2-х лет автозаправочной станции, возместить потери сельскохозяйственного производства в сумме 6 140 500 руб.* | 847 780 руб. |
| 4. | Право аренды земельного участка сроком на 50 лет | ул. Левонабережная, У-33 | 0,1198 | 440100000001004880 | 155 000 000 | 15 500 000 | Аукцион с условием | Строительство в течение 2-х лет предприятия общественного питания* | 3 985 750 руб. |

* с подробной информацией об условиях строительства объекта можно ознакомиться по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2, каб. № 57 в рабочие дни с 8.30 до 17.30, тел. (0152) 720546.

Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1) Копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет 3012000006896 в фил. 426 АСБ «Беларусбанк», код 199, УНП 590727594, получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

**Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

**Физическое лицо:** паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2) Платеж за объект осуществляется по безналичному расчету в течение 10-ти календарных дней с момента вынесения решения горисполкома о передаче земельного участка победителю аукциона.

**Аукцион состоится 17 ноября 2009 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2.** Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2, каб. № 57 в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Заявления принимаются с 19 октября по 11 ноября 2009 г.** Телефон для справок в Гродно (0152) 720546. Адрес сайта: **www.gorod.grodno.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
## по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества

| Наименование предмета аукциона | Производственное здание и здание сарая и право заключения договора аренды земельного участка | Здание специализированное связи и право заключения договора аренды земельного участка | Здание отделения почтовой связи с холодной пристройкой, сараем и уборной и право заключения договора аренды земельного участка | Капитальное строение и право заключения договора аренды земельного участка | Капитальное строение (вспомогательное здание столовой) и право заключения договора аренды земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|
| **Местонахождение недвижимого имущества** | Брестская область, Ивановский район, Снитовский с/с, д.Снитово | Брестская обл., Пружанский р-н, д. Поросляны, 158 | Брестская область, Дрогичинский район, д. Малиновка, ул. Советская, д. 6 | Брестская обл., г. Барановичи, ул. Брестская, 282 | Брестская обл., Ивацевичский р-н, 2,2 км юго-западнее д. Холопья |
| **Продавец недвижимого имущества** | РУПАД «Брестаавтодор» тел. 8 0162 20 31 09 | РУП «Белпочта» тел. 8 0162 20 57 80 | | Эксплуатационное республиканское унитарное предприятие «Опытная путевая машинная станция № 115» Белорусской железной дороги, тел. 80163 49 27 75, 49 27 81 | Министерство энергетики РБ (в лице ОАО «Белтрансгаз) тел. 8017 219 14 37, 801562 7 23 53 |
| **Сведения о предмете аукциона** | Производственное здание – 1-этажн., 1979 г.п, общая площадь – 47,5 кв.м, кирпичное, в состав кап. строения входит пристройка. Сарай 1-этажный 1991 г.п., общая площадь – 36,3 кв.м, кирпичный. Земельный участок площадью 1,6538 га, срок аренды – 90 лет | Здание 1-этажн., деревянное, с холодной пристройкой, верандой, 1957 г.п., общая площадь – 75,9 кв. м. Земельный участок площадью 0,1506 га; срок аренды – 49 лет | Здание 1-этажн., общая площадь – 56,6 кв.м сборо-щитовое облиц. кирпичом, в состав имущества входит холодная пристройка, сарай и уборная. Земельный участок площадью 0,1014 га, срок аренды – 50 лет | Здание столовой 1982 г.п., 1-этажн., кирпичное, общая площадь – 386,3 кв.м. Земельный участок площадью 0,1131га, под размещение объекта торговли, по оказанию услуг населению, административного, производственно-складского назначения, либо общественного питания, срок аренды – 50 лет с последующим продлением срока аренды | Здание 1985 г.п., 1-этажн., площадь – 143 кв.м. Земельный участок площадью 0,0628га, срок аренды –- 50 лет |
| **Начальная цена предмета аукциона, руб.** | 19 355 388 | 13 103 120 | 9 869 050 | 207 073 569 | 32 059 203 |
| **Сумма задатка, руб.** | 1 935 500 | 1 310 000 | 986 900 | 20 707 000 | 3 205 000 |
| **Организатор аукциона** | **Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. (0162) 23 44 06, 23 12 63, 20 87 85, 23 44 78, www.brest-region.by** | | | | |

Аукцион состоится **17 ноября 2009 года в 11.00** по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

**Для участия в аукционе представляются:**

Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество» с документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538, срок внесения – по 16 ноября 2009 г. включительно;

негосударственным юридическим лицом Республики Беларусь, индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

при подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

**Участник, ставший победителем аукциона (претендент на покупку), обязан:** подписать протокол аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результаты такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Порядок организации и проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

**Заявления на участие в аукционе с необходимым пакетом документов принимаются** по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 17.30 по рабочим дням по 16 ноября 2009 года включительно.

## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
## без условий по продаже имущества предприятия, находящегося в процедуре банкротства с ликвидацией
(цены снижены на 10 %)

| | |
|---|---|
| **Адрес объекта и его наименование** | Расположен по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Городокская, д. 100 «А». Объект продается одним лотом.<br>- ремонтные мастерские и административно-бытовой корпус общей площадью 596 кв. м, год постройки ремонтных мастерских — 1994; административно-бытового корпуса — 2007 г.<br>- ограждение железобетонное (плиты размером 4х2 м в количестве 18 шт.);<br>- основные средства и оборотные активы согласно перечня, начальная цена объекта **1 168 200 000 рублей**, в т. ч. НДС **178 200 000.**<br>Решение об отводе земельного участка, пл. 0,2780 га, имеется. Порядок проведения аукциона и подробный перечень имущества оговорен в условиях аукциона.<br>Оплата за объект производится в течение 20 дней со дня проведения аукциона. Задаток 5 % от начальной цены лота перечисляется на р/с 3012203400038 в отделении ОАО «Белагропромбанк» в г. Молодечно, код 914, УНП 600077843, ОКПО 05414829, получатель: СУП «МПМК № 197» ОАО «Забудова-строй». Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» № 164 от 02.09.09 г. |
| **Конечный срок и адрес приема заявок** | 05.11.09 до 16 часов, г. Вилейка, ул. Горького, д. 7, кв. 8, управляющий СУП «МПМК № 197» ОАО «Забудова-строй», тел. (8 01771) 5 36 77 (факс), МТС 8 029 578 36 77; velcom 8 029 685 36 77. |
| **Дата, время и место аукциона** | 06.11.2009 г. в 12 часов, г. Молодечно, ул. Городокская, д. 100 «А» |
| Аукцион состоится при наличии не менее двух участников на один лот. | |

# ЦІ ДОЎГА РАДЫЯТАРНЫ ЗАВОД БУДЗЕ АТРУЧВАЦЬ СТАЛІЦУ?

**ТЭМА гэта не новая. Больш за тое, нават збітая, яе неаднойчы «перацірілі» і ў СМІ, і на розных узроўнях улады, але праблема пакуль канчаткова не вырашаная, і дзясяткі тысяч людзей працягваюць пакутаваць ад выкідаў, бадай, самага «смярдзючага» завода ў Мінску. Адсюль і шматлікія звароты на «гарачыя лініі», і званкі ў рэдакцыі. Прычыны і наступствы выкідаў радыятарнага завода па-ранейшаму хвалююць значную частку насельніцтва сталіцы. У прыватнасці, пытанне аб верагодным пераносе завода за межы Мінска, аб чым даўно ідуць размовы. Наш карэспандэнт паспрабаваў разабрацца ў праблеме.**

## Ахвяры ўрбанізацыі

Радыятарны завод і тыя, хто цярпіць ад яго шматгадовай дзейнасці, у пэўным сэнсе ахвяры ўрбанізацыі. Яго некалі ўзводзілі на ўскрайку сталіцы, дзе спачатку і не планавалася жыллёвае будаўніцтва, а цяпер завод амаль што ў цэнтры горада і непадалёку ад яго самай прыгожай часткі — праспекта Пераможцаў. Відаць, гэта праблема і бяда многіх вялікіх гарадоў — калі ў выніку бурнай забудовы масіваў жылля ў цэнтры апынуліся шматлікія заводы. У Мінску іх даволі шмат. І калі на адных прадпрыемствах адносна бясшкодная вытворчасць для атмасферы, то іншыя яе забруджваюць. Сярод іх пальму першынства трывала ўтрымлівае так званы радыятарны завод. Яго поўная назва: ААТ «Мінскі завод ацяпляльнага абсталявання». Трэба сказаць, вельмі спецыфічная вытворчасць. Яе выкідамі ў паветра прадпрыемства час ад часу, у залежнасці ад ружы вятроў, шчодра «адорвае» жыхароў асобных кварталаў і мікрараёнаў сталіцы — жудаснымі кіслымі пахамі металічнай акаліны і шкоднымі для здароўя рэчывамі.

## Нявыкананае абяцанне

(З перапіскі Мінгарвыканкама з насельніцтвам.)

*Пошук адказу на пытанне, калі ж гэта нарэшце скончыцца, прывёў мяне на форум сайта Мінгарвыканкама. Там па тэме нашай публікацыі ў рэжыме пытанне — адказ утрымліваецца цікавая перапіска з абуранымі выкідамі радыятарнай вытворчасці мінчанамі.*

*Вось фрагменты гэтай перапіскі жыхароў з гарадскімі ўладамі. Нехта Андрэй (06.08.2007) інфармуе і пытаецца: На вуліцы Ціміразева рэгулярна смог, бо прадпрыемства забруджвае атмасферу. У некаторыя дні па вечарах знаходзіцца ў раёне вуліцы Гвардзейскай немагчыма. Хто-небудзь кантралюе негатыўны ўплыў гэтага завода на экалогію горада?*

*Яшчэ адзін зварот — ад Мікалая Вячаслававіча (20.07.2007): Прашу звярнуць увагу на моцную загазаванасць па вул. Ціміразева. Дым ад вытворчасці, верагодна з ліцейкі, распаўсюджваецца на жылыя кварталы паміж вул. Ціміразева і праспектам Пераможцаў і нават у Вяснянку. Верагодна, гэта кампетэнцыя Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, улічваючы размяшчэнне крыніцы задымлення і яго распаўсюджанасць.*

Галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Фрунзенскага раёна А.Л. Войцік дае ім аператыўны адказ у лепшых традыцыях чыноўніцкага эпісталярнага жанру. Адчуваецца жаданне супакоіць і абнадзеіць не толькі аўтараў гэтых зваротаў, але і ўсіх мінчан, хто сябруе з інтэрнэтам і моцна заклапочаны выкідамі МЗАА. Зразумела, вынікае з адказу, у зоне ўплыву выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасферу праводзіцца пастаянны і перыядычны лабараторны кантроль. Рэгулярныя назіранні вядуцца на стацыянарным посце Рэспубліканскага цэнтра радыяцыйнага кантролю і маніторынгу навакольнага асяроддзя па вул. Ціміразева, 23 і забяспечваюць сістэму кантролю за ўзроўнем забруджвання атмасфернага паветра. Таксама праводзяцца назіранні Мінскім гарадскім цэнтрам гігіены і эпідэміялогіі, 2 разы ў месяц па 10 рэчывах адбываюцца даследаванні на маршрутных пастах. У рамках лакальнага маніторынгу навакольнага асяроддзя ведамаснай лабараторыяй МЗАА штомесяц ажыццяўляецца кантроль на крыніцах выкідаў і ў 12 кантрольных пунктах, размешчаных на мяжы санітарна-ахоўнай зоны прадпрыемства. Цяпер тэхналогія ліцейнай вытворчасці сертыфікаваная па сістэме якасці ў рамках міжнародных стандартаў серыі ISO-9000. Завод актыўна ўкараняе сістэму кіравання навакольным асяроддзем у адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі серыі ISO 14000. Асноўнай экалагічнай праблемай ліцейнай вытворчасці з'яўляецца прадухіленне выкідаў у атмасферу шкодных рэчываў ад тэхналагічнага абсталявання. На ўсіх асноўных крыніцах выкідаў ёсць газаачышчальнае абсталяванне. Усяго эксплуатуецца каля 50 установак мокрай і сухой ачысткі.

> **Пераносу радыятарнага завода за межы Мінска, як меркавалася раней, не будзе.**

Далей ідзе доўгі і малазразумелы для неспецыяліста пералік на тэхнічнай мове прынятых мераў і захадаў, якія будуць хутка зроблены. Не будзем іх пералічваць, толькі звернем увагу на наступныя звесткі з адказу: дзякуючы намаганням калектыву завода ўдалося дасягнуць пэўных вынікаў. Усяго (удумайцеся ў гэтыя лічбы) у выніку выканання тэхналагічных і экалагічных мерапрыемстваў, адбылося паніжэнне выкідаў шкодных рэчываў у атмасферу за папярэднія пяць гадоў на 305,9 тоны і змяншэнне адходаў вытворчасці (адыходаў фармовачных і стрыжнёвых сумесяў) больш як на 6000 т/год. А выдаткі на прыродаахоўныя мерапрыемствы, між іншым, за апошнія пяць гадоў склалі амаль 3 млрд. рублёў.

Ну, а далей у адказе пайшла суцэльная «прапаганда», якой сёння не асабліва верыцца. Галоўны санітарны ўрач раёна праяўляе выдатную тэхнічную і тэхналагічную дасведчанасць, аптымізм і абсалютную перакананасць у тым, што ўсе работы па мадэрнізацыі і рэканструкцыі ліцейнай вытворчасці завода плануюцца і вядуцца з улікам перадавога досведу вядомых еўрапейскіх вытворцаў ліцейнага абсталявання. Так сцвярджаць бы міністру прамысловасці, а не санітарнаму ўрачу. Неяк не вельмі сціпла. Бо адкуль упэўненасць у тым, што ў хуткім часе на заводзе будзе выкананы чарговы комплекс мерапрыемстваў, якія дазволяць знізіць экалагічную шкоду навакольнаму асяроддзю. Сярод іх, заўважым, рэканструкцыя плавільнага аддзялення з заменай наяўных ваграна к на ваграпкі закрытага тыпу. І сапраўды, толькі яго рэалізацыя, як распавядае санітарны ўрач, «дазволіць знізіць неспрыяльны ўплыў завода на навакольнае экалагічнае становішча».

Але сутнасць у тым, што гэта абяцанне не было выканана. Магчыма, многае ўдалося зрабіць для паляпшэння экалагічнай сітуацыі. Але вельмі далёка не ўсё, што трэба для таго, каб абараніць горад ад шкодных выкідаў. І чарговая «хімічная атака» (тэрмін узяты з інтэрнэта, дзе актыўна абмяркоўваецца дзейнасць завода) адбылася ў пачатку восені. Інтэрнэт, дарэчы, тады літаральна выбухнуў негатыўнымі ацэнкамі яго карыстальнікаў адносна чарговага «сюрпрызу» завода. Можна па-рознаму ставіцца да звестак і каментарыяў у глабальным павуцінні, але нельга не заўважаць тую акалічнасць, што колькасць карыстальнікаў інтэрнэта расце надзвычай хутка. І інтэрнэт усё істотней уплывае на фарміраванне грамадскай думкі, асабліва сярод моладзі. І няўклюдныя спробы не заўважаць гэты сродак абмену інфармацыяй і думкамі ці фармальна рэагаваць на яго наскокі, сёння па меншай меры дэманструюць недальнабачнасць. Скажыце, навошта трымаць на форуме сайта Мінгарвыканкама казённа-бадзёры і састарэлы фактычна і маральна адказ галоўнага дзяржаўнага санітарнага ўрача Фрунзенскага раёна? Форум на сайце, нагадаем, гэта інструмент аператыўных зносінаў паміж карыстальнікамі інтэрнэта. І калі Мінгарвыканкам у іх ліку, то навошта, як гаворыцца, дражніць гусей?

## Пазіцыя завода

Намеснік галоўнага інжынера начальнік службы аховы навакольнага асяроддзя МЗАА Міхаіл Барысаў на пальцах растлумачвае мне сутнасць пытання. У двух словах, каб атрымаць чыгун, з якога вырабляюцца радыятары, яго трэба, так бы мовіць, зварыць. Працэс гэты адбываецца ў спецыяльнай печы — вагранцы. Выплаўляецца чыгун у ваграпках двух тыпаў: адкрытага і закрытага. На МЗАА, на жаль, выкарыстоўваецца адкрыты тып ваграпкі. Праз яе трубу дыяметрам два метры адыходы гарэння коксу і металу трапляюць у паветра. Праўда, за апошнія 10 гадоў нямала зроблена на прадпрыемстве для «перахопу» шкодных выкідаў, але і той іх нязначны працэнт, які прарываецца ў атмасферу праз спецыяльнае абсталяванне, дае пра сябе ведаць дурным пахам, пяршэннем у горле, дрэнным адчуваннем астматыкаў, алергічнымі рэакцыямі.

Ёсць два спосабы вырашэння праблемы: перанесці вытворчасць радыятараў за горад ці ўзвесці печы (ваграпкі) закрытага тыпу. Першы варыянт, вядома, не толькі лепшы — ідэальны, але з-за дарагоўлі нерэальны. Прыкладная цана пытання — каля 200 млрд рублёў. У бюджэце на гэта грошай няма, няма і інвестараў, якія хацелі б укласці сродкі ў будаўніцтва новага завода. Закрытыя ваграпкі — таксама далёка не танны праект (у межах двух мільёнаў еўра), але ён больш прымальны.

Таму хутка, літаральна ў кастрычніку, адбудуцца перамовы з прадстаўнікамі нямецкай фірмы. Для прадпрыемства ўзвядзенне ваграпкі закрытага тыпу — даволі адчувальныя выдаткі, нават нягледзячы на спрыяльную для яго эканамічную сітуацыю — удалы збыт гатовай прадукцыі, якая не залежваецца на складзе. Былі спадзяванні на дапамогу гарадскога бюджэту, але горад маўчыць, а таму ў многім пад ціскам абставінаў і грамадскага меркавання вырашылі ўласнымі сіламі ўзяцца за працу. Завяршыць яе мяркуюць у наступным годзе.

Думаецца, тлумачэнні Міхаіла Барысава праясняць сітуацыю, хоць і не факт, што нарэшце на заводзе зробяць ваграпку закрытага тыпу ў вызначаныя тэрміны. Бо там больш за паўгода чакалі бюджэтных грошай і не дачакаліся. І такім чынам згубілі час.

## «Шайбу! Шайбу!», ці Хакей нам дапаможа

У мінчан, якія жывуць у зоне ўплыву шкоднага прадпрыемства, ёсць надзея на сусветны чэмпіянат па хакеі, які пройдзе ў Мінску ў 2014 годзе. Наўрад ці бацькі горада і ўлады краіны дапусцяць, каб гэтае свята азмрочыў смурод ад радыятарнага. Старшыня Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандр Баравікоў упэўнены, што ў 2010—2011 гадах сітуацыя з выкідамі прадпрыемства нармалізуецца. Па яго словах, хутка адбудзецца ўзмацненне камітэтам нарматываў да вытворчых адходаў, якія ўплываюць на стан атмасфернага паветра. Дзякуючы намаганням камітэта, на радыятарным перасталі пераплаўляць металічную стружку разам з рэшткамі нафтапрадуктаў. Менавіта гэтае спалучэнне надавала асаблівы смурод ветру з завода.

Начальнік спецыяльнай інспекцыі дзяржкантролю за аховай атмасфернага паветра і азонавага слою Сяргей Заўялаў гаворыць, што за апошнія 10 гадоў на радыятарным шмат зроблена для зніжэння прамысловых выкідаў. Так, укладзены сур'ёзныя інвестыцыі ў тэхнічнае і тэхналагічнае пераўзбраенне, і гэта праца працягнецца ў наступным годзе. І ёсць надзея, што нарэшце не будзе смярдзець металічнай акалінай з радыятарнага завода. Бо, напрыклад, у Аўстрыі роднаснае яму прадпрыемства знаходзіцца побач з гарналыжным курортам. І гэта суседства не перашкаджае людзям адпачываць і атрымліваць асалоду ад прыроды.

Аднак няма аніякіх гарантый, што завод пачне ўзводзіць ваграпку закрытага тыпу з сучасным газаачышчальным абсталяваннем менавіта ў 2010 годзе. Рознае можа перашкодзіць. Крызіс жа не скончыўся. Вельмі б хацелася, каб горад у сваю чаргу падтрымаў прадпрыемства не толькі маральна, але і знайшоў сродкі на паскарэнне рэканструкцыі, каб вытворчасць МЗАА адпавядала сучасным санітарным патрабаванням.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

Сітуацыя

# У «ІХ» СЛУЖБА ВЫРАТАВАННЯ «911», А Ў НАС?



**НА карпункт «Звязды» патэлефанавала жыхарка Баранавічаў Ніна Калеснікава і расказала пра праблему, з якой ёй давялося сутыкнуцца.**

Жанчына не здолела адчыніць дзверы сваёй кватэры і пачала шукаць дапамогі. Пазваніла ў ЖЭС, але там адмовілі, бо яе кватэра знаходзіцца вышэй за трэці паверх. Тады Ніна Рыгораўна звярнулася ў МНС горада, але безвынікова. «Няўжо ў нас няма ніякай экстраннай службы, якая прыйшла б чалавеку на дапамогу ў любы час сутак? — пытаецца Н. Калеснікава.

Наглядзеўшыся па тэлебачанні на амерыканскую службу выратавання «911» і на аналагічную структуру ў Расіі, якія спрытна дастаюць пальцы ці галовы дзяцей з розных прадметаў, катоў з вентыляцыйных шахтаў і г.д., захацелася даведацца: ці ёсць у нас падобная служба?

Пачаў з ЖЭСа, але там выслухаўшы мяне, папрасілі пазваніць пазней. Маўляў, няма начальніка, а без яго нічога гаварыць не будзем. На гэтым размова і закончылася, бо тэлефон жыллёва-эксплуатацыйнай службы цэлы дзень ужо быў заняты.

І тады я падаўся ў мясцовую часць МНС, дзе сустрэўся з намеснікам начальніка аддзела Уладзімірам Лопухам, які растлумачыў сітуацыю са скаргай нашай чытачкі.

*— Відавочна, жанчына нешта не так зразумела, бо мы робім і платныя паслугі. Трапіць у кватэру для нас не такая ўжо і праблема — трэба толькі аплаціць работу.*

— Можна больш падрабязна даведацца пра платныя паслугі, каб людзі ведалі, што і да чаго.

*— Калі нешта пагражае жыццю ці здароўю чалавека, мы тут жа выязджаем на месца, паведамляем пра здарэнне ў Брэст і дапамагаем. У гэтым выпадку — ніякай платы. Напрыклад, дзверы чалавек не можа адчыніць, а ў кватэры засталося дзіця, то ніякай размовы пра грошы не будзе — нашы супрацоўнікі выручаць, — патлумачыў У. Лопух. — А вось калі дзверы зачыніліся па віне гаспадара, а ў кватэры нікога, то тут неабходна плаціць.*

— Многа?

*— Давайце абыграем сітуацыю з дзвярыма, якія трэба адчыніць. Мы адмычкамі не карыстаемся, а дзверы стальныя ды і дарагія. Гаспадары просяць, каб замок не выразалі, а залезлі ў кватэру праз акно. Калі кватэра на трэцім паверсе, то туды можна трапіць па звычайнай лесвіцы, якая знаходзіцца на пажарнай машыне. У такім выпадку давядзецца заплаціць 43 тысячы рублёў за гадзіну працы. А цяпер уявім, што кватэра вышэй за трэці паверх, напрыклад, на восьмым. Каб трапіць у яе праз акно, патрэбна спецыяльная аўталесвіца, а яе выкарыстанне абыдзецца ў 91 тыс. рублёў у гадзіну. Калі ж праца зойме менш часу, то і плата меншая.*

> **Калі нешта пагражае жыццю ці здароўю чалавека, мы тут жа выязджаем на месца, паведамляем пра здарэнне ў Брэст і дапамагаем. У гэтым выпадку — ніякай платы.**

— Уладзімір Уладзіміравіч, вось у вас у баявой гатоўнасці стаяць машыны, дзяжураць супрацоўнікі і што, вы іх па любым сігнале пасылаеце выпраўляць нечыя агрэхі?

*— Баявыя машыны і разлікі знаходзяцца на пасту, а ў нас ёсць рэзервовая машына і чалавек, якога мы можам у любы момант выклікаць.*

— Напэўна, складанасці ў працы ёсць. Людзі са сваімі характарамі, надзвычайныя сітуацыі...

*— Вось чалавек тэлефануе, што яго кватэру залівае сусед. Прыязджаем, а ў кватэры паверхам вышэй нікога няма. Мы, як і міліцыя, без гаспадара ў кватэру не маем права зайсці, вось і даводзіцца падключаць камунальнікаў, якія перакрываюць ваду ў доме ці пад'ездзе. Нашы правы таксама абмежаваныя. Нават каб дрэва спілаваць у горадзе, неабходна адпаведнае рашэнне мясцовай улады.*

— У часы, калі не было МНС, мне патэлефанавала жанчына і паведаміла, што на сасне каля стадыёна трэція суткі сядзіць кот і енчыць на ўсю вуліцу. Я пазваніў у пажарную часць, і таго ката з дрэва знялі. А ці ўваходзіць у функцыі сучаснага падраздзялення МНС выратаванне жывёлы?

*— І жывёлу ратуем. Вось у каналізацыйны калодзеж трапілі два сабакі, то мы іх даставалі. А нядаўна байцоўскі сабака ўскочыў у краму і зрабіў перапалох. Давялося нашым супрацоўнікам адтуль яго выводзіць. Ды мала што бывае. Ліса на курэй напала, то нам звоняць, — кажа мой суразмоўца. — Па любой нагодзе звяртаюцца да нас. Чалавек знайшоў на сметніку трубкі і пачаў у гаражы іх распілоўваць, а адтуль пацякла ртуць — супрацоўнікі МНС выехалі.*

— Пажары сёння не рэдкасць. Гараць дамы на раёне, ды і ў горадзе, здараецца. Праблема?

*— Яшчэ якая праблема, бо 80 % пажараў узнікае ад палення ў ложку. Класічны варыянт: выпіў, прылёг, запаліў цыгарэту і... задыхнуўся. З усіх, хто загінуў у агні, — 90 % курылі ў ложку. Але ж чалавек на чужой бядзе не вучыцца...*

У Расіі пажарная служба і МНС — дзве асобныя структуры, а ў Беларусі яны аб'яднаныя ў адну, якая падпарадкоўваецца Міністэрству па надзвычайных сітуацыях. Але гэта прынцыпова нічога не мяняе. Калі здарылася бяда, узнікла праблема, то набірайце нумар «101», і вам дапамогуць.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ. Фота аўтара.**

Казкі для дарослых

# НЕЗЯМНОЕ ПРЫЦЯГНЕННЕ

БЫЎ снежань. Звычайны снежань, халодны і маўклівы... Працоўны дзень заканчваўся, але думка аб гэтым не грэла. Я падышла да люстэрка, якое вісела ў кутку за дзвярыма, і ўважліва агледзела сябе з ног да галавы. Трэба прызнацца, апошнім часам гэты працэс не прыносіў мне задавальнення. Ніякія цудадзейныя крэмы, заняткі на трэнажорах і модная галівудская дыета не давалі прыкметных вынікаў. Скура на твары заставалася бледнай, цёмныя «кругі» пад вачыма не знікалі, а колькасць маршчынак толькі павялічвалася... Але галоўнае было не ў гэтым. Галоўнае заключалася ў тым, што сам твар перастаў выпраменьваць святло, а вочы нібыта патухлі...

— Ну што, сяброўка, — звярнулася я да свайго адлюстравання, — дзе талію рабіць будзем?

«Адлюстраванне» крывавата ўсміхнулася... Усё правільна. На яго месцы я таксама не ведала б, што адказаць.

У гэты момант цішыню кабінета прарэзаў званок. Менавіта прарэзаў, таму што гэта быў не проста званок, а званок па ўнутранай сувязі.

— Тэрмінова зайдзіце да дырэктара! — ледзяным тонам паведаміла Агнэса Казіміраўна, сакратарка нашага шэфа.

Цікава, што магло здарыцца ў другой палове дня, тым больш у пятніцу, каб ён затрымаўся на працы? Я адарвалася ад люстэрка, паправіла прычоску, змахнула са спадніцы нябачныя пылінкі і, прыхапіўшы на ўсякі выпадак папку з паперамі, рушыла ў бок кабінета нумар 1.

— У вас пашпарт у парадку? — агарошыў шэф пытаннем, як толькі я пераступіла цераз парог.

— А што? — усхвалявалася я.

— Мне патэлефанавалі з... самі здагадваецеся, адкуль, — ён красамоўна матнуў галавой у бок столі. — Ад нас патрэбен чалавек для паездкі ў Берлін. Немцы праводзяць семінар па тэме... па тэме... Карацей, гэта мае непасрэднае дачыненне да спецыфікі вашага аддзела... Вось, можаце азнаёміцца з праграмай. Вылет праз два тыдні.

У той момант я паверыла, што цуды здараюцца. І паглядзела на яго з замілаваннем. Але шэф гэтага не заўважыў. Набраўшы нумар тэлефона, ён паведамляў «каму трэба» маё прозвішча, імя і год нараджэння...

— Вам 38? — крыху здзіўлена ўдакладніў ён, паклаўшы трубку. Я заскрыгатала зубамі: мог бы хоць з ветлівасці не перапытваць.

— У канцы снежня будзе 39...

— Ну вось і цудоўненька, — усміхнуўся ён, каб знівеліраваць напружаны момант. — Сустрэнеце дзень нараджэння ў новых абставінах.

З ПРАЦЫ я пайшла пешшу. І не па тратуары, на якім прытаптаны за дзень снег ператварыўся ў суцэльную лядовую дарожку, а дварамі і малазнаёмымі вулачкамі. Хацелася заняцца самаедствам, хацелася адшукаць адказы на шматлікія «чаму?». Чаму ўсё заўсёды пачынаецца так прыгожа і заканчваецца так банальна? Хто вінаваты і, галоўнае, што рабіць? Пытанні не мелі ніякага дачынення да будучай паездкі, затое напрамую датычыліся майго асабістага жыцця, якое, як мне падавалася, зайшло ў тупік...

З мужам мы жылі разам так даўно, што часам нават не заўважалі адно аднаго, не кажучы ўжо пра тое, каб чуць. Ён займаўся рэжысурай — дакладней, думаў, што займаецца. Насамрэч, зняўшы яшчэ ў ранняй маладосці парачку дакументальных фільмаў пра «герояў пяцігодкі», ён вырашыў канчаткова здрадзіць мастацтву і перакваліфікаваўся ў дырэктара фірмы па вытворчасці рэкламных ролікаў. Тады гэта было модна і вельмі запатрабавана. І пакуль муж «каваў» свае ролікі, наш шлюб пакрысе разыходзіўся па швах. Я не сказала «трашчаў па швах». Ён тануў павольна, як «Тытанік». Па вечарах мы прыходзілі дадому, моўчкі вячэралі і разыходзіліся па сваіх пакоях. Яго абсалютна не цікавіла, што адбывалася са мной на працягу дня, тыдня, месяца, года... А мяне цягнула на ваніты ад яго самаўлюбёных маналогаў у стасунках з падначаленымі. У рэшце рэшт яго фірма лопнула, пакінуўшы на памяць аб сабе парутройку дастаткова бляклых рэкламных праектаў... Цяпер, працуючы ў прыватнай тэлекампаніі звычайным «хлопчыкам на пабягушках», ён ператварыўся ў «пакрыўджанага лёсам» і стаў абсалютна невыносным. Сітуацыя ўскладнялася яшчэ і тым, што мая кар'ера, наадварот, складвалася дастаткова ўдала. Але кожны мой пераход на наступную прыступку суправаджаўся градам насмешак і зневажанняў — так мая каштоўная «палова» помсціла за свае нерэалізаваныя амбіцыі...

Потым у маім жыцці з'явіўся Ён. Не тое каб ён меў шэраг бясспрэчных вартасцяў... Хутчэй, проста апынуўся ў патрэбным месцы (на аўтобусным прыпынку) у патрэбны час — шэф папрасіў мяне хуценька адвезці справаздачу ў галоўнае ўпраўленне. Прыйшлося тармазнуць цёмна-сінюю «Аўдзі». Вадзіцель быў ненавязлівым, па дарозе дасціпна жартаваў, як бы між іншым рабіў кампліменты... А калі развіталіся, усунуў у руку візітку з лагатыпам медыцынскага цэнтра, дзе, аказваецца, працаваў.

Яго звалі Ігар Уладзіміравіч, і, напэўна, я магла б у яго закахацца. Напэўна... Ва ўсякім разе, мне вельмі хацелася гэтага. Я была звычайным зямным чалавекам, жанчынай. А жанчына, калі доўга жыве ў стане адсутнасці кахання, ператвараецца ў выпаленую пустэчу, дзе ўжо нічога не можа ўзысці... Мне не хацелася станавіцца пустэчай.

У першую нашу сустрэчу ён павёў мяне ў рэстаран. Спатканне адбывалася днём — нам абаім так было больш зручна... Мне імпанавалі яго ўраўнаважанасць і стрыманасць і тое, што ён не праспешваў «развязку», якая падавалася непазбежнай... Мы пілі шампанскае і вялі нязмушаную гутарку, цудоўна разумеючы, што кожны выпіты глыток і кожнае сказанае слова набліжаюць нас да кульмінацыйнага моманту... Недзе перад падачай дэсерту ў яго зазваніў тэлефон. Размова па мабільным заняла секундаў дзесяць і закончылася яго цвёрдым абяцаннем «быць дома праз паўгадзіны».

Я зусім не драпежніца і паважаю законы чужой сям'і. Пра што і сказала Ігару Уладзіміравічу, зноў перайшоўшы на «вы». І яшчэ дадала, што сапраўдны мужчына вылучаецца ў першую чаргу тым, што імкнецца не дапускаць памылак у адносінах з жанчынай. У той час як «несапраўднаму» пастаянна даводзіцца іх выпраўляць... Ён паабяцаў больш не дапускаць памылак у адносінах са мной. Аднак з зайздроснай рэгулярнасцю наступаў на адны і тыя ж граблі. Варта толькі было нам кудынебудзь выбрацца ўдваіх, як адразу ж пачыналіся тэлефонныя атакі яго жонкі з допытамі накшталт «дзе ты?» і «калі будзеш?». Я падумвала ўжо: а ці не паставіць кропку ў гэтым «непачатым рамане», у гэтых цнатліва-піянерскіх адносінах?.. І ставіла. Але праходзіў нейкі час, і Ігар знаходзіў мяне зноў. І ўсё пачыналася спачатку. А аднойчы я нават злавіла сябе на думцы, што... баюся яго страціць. Баюся развітацца з апошнім мужчынам, якому я па-сапраўднаму (як мне здавалася) патрэбная...

Словам, усё так заблыталася і так пераплялося, што паездка, у якую я павінна была адправіцца з лёгкай рукі нашага шэфа, аказалася вельмі да месца.



У аэрапорт ад'язджалі рана — у пяць гадзін. Заснежаны горад яшчэ спаў. Адзінокія ліхтары, залепленыя снегам, з апошніх сілаў змагаліся з цемрай. Тысячы сняжынак хаатычна рухаліся ў паветры, выконваючы нейкі вар'яцкі танец... Ад прадчування змены абставінаў на душы было лёгка і радасна. У аўтобусе, які вёз нас да аэрапорта, напаўголасу перагаворваліся людзі, і ад гэтага таксама рабілася па-хатняму ўтульна...

Наша група (чалавек дзесяць) дастаткова хутка прайшла «фэйс-кантроль». Мне нават не прыйшлося перацягваць з месца на месца велізарную багажную сумку, набітую пад завязку «самымі неабходнымі» рэчамі. Мужчына, які стаяў за мной у чарзе на рэгістрацыю, прапанаваў свае паслугі. Ён быў не з нашай групы, і я наўрад ці рызыкнула б даверыць свае рэчы «чужынцу». Але пярэчыць не стала, бо падумала: калі раптам яму стрэліць у галаву збегчы з маёй валізкай, яго яркую куртку можна будзе лёгка вылічыць у натоўпе.

У самалёце мне дасталася месца побач з Алінай, спецыялістам па сувязях з грамадскасцю адной значнай «канторы». Напэўна, яна была незадаволена гэтым фактам, бо, не паспеўшы яшчэ ўладкавацца як след, пачала круціць галавой, адшукваючы свабоднае крэсла паблізу ад «нашых» мужчын.

— Вы хочаце перасесці? Давайце мяняцца, — пачула я знаёмы голас. З крэсла ў пярэдняй частцы салона падняўся мужчына і пайшоў па праходзе насустрач Аліне. Яна зашчабятала словы ўдзячнасці, як бы між іншым пацікавіўшыся, да каго ён ляціць у Берлін.

— Да сям'і. У мяне там жонка і сын, — адказаў ён проста, уладкоўваючыся ў крэсле побач са мной і складваючы ў пакет знаёмую куртку з яркімі ўстаўкамі. — Вы не супраць?

Апошняе пытанне відавочна датычылася мяне.

— Ды ляціце вы да каго хочаце — ваша справа!

Я не збіралася адказваць раздражнёна, але атрымалася менавіта так. І ён не мог не адчуць гэта.

— Вы не супраць таго, што я буду сядзець побач з вамі? — удакладніў ён.

Супраць? Вось яшчэ... Што ён сабе напрыдумваў? Ды мне абсалютна ўсё роўна, хто і дзе будзе сядзець. Мне абсалютна...

І тут я зазірнула ў яго вочы, у самае іх дно... Дарэчы, гэта даўно правераны і дзейсны спосаб. Калі хочаш атрымаць аб мужчыне максімальна праўдзівую інфармацыю, паглядзі не на яго — паглядзі ўнутр яго. І прачытаеш шмат карыснага.

Я зазірнула дастаткова глыбока, і тое, што ўбачыла, мне спадабалася. На самым дне сур'ёзных, нават крыху сумных яго вачэй... скакалі чарцяняты. Адно — у правым воку, другое — у левым... «Чаму б і не?» — падумала я.

Сцюардэса разносіла па салоне сок і шампанскае. Ужо не вагаючыся, ён папрасіў для мяне і першае, і другое. І ўвогуле ўзяў на сябе кіраванне ходам падзей. Паміж сабою мы па-ранейшаму заставаліся на «вы». Але яго рука — незнарок — усё часцей дакраналася да маёй, і я адчувала яе цеплыню... Мы гаварылі пра ўсё, не баючыся пры гэтым падацца смешнымі ці застацца незразумелымі. У нас наперадзе было цэлых дзве гадзіны часу — і ніякіх абавязацельстваў. І ніякіх бар'ераў, і ніякіх умоўнасцяў. І ніякай будучыні... Толькі непазбежнасць рэальнасці. Мы не маглі сысці на наступным прыпынку, каб сустрэцца зноў, — таму што на наступным прыпынку нашы дарогі павінны былі разысціся назаўсёды... Усё гэта палохала і адначасова неверагодна заводзіла... Я адчувала сябе дзяўчынкай, здольнай несці ўсялякую лухту і расказваць пра сябе ўсё-ўсё-ўсё. Ён слухаў гэту лухту так уважліва і з такой непрыхаванай зацікаўленасцю, быццам перад ім у гэты момант раскрывалася Кніга Сусвету...

Нарэшце, стомленыя калейдаскопам падзей, адчуванняў і ўражанняў, мы заплюшчылі вочы. Гэта атрымалася сінхронна — у адзін момант і ён, і я быццам усвядомілі крохкасць таго, што адбываецца, і захацелі захаваць у памяці гэта імгненне... На некалькі секундаў я адкінула назад галаву, каб удыхнуць паветра глыбей, і наткнулася на яго плячо. «Усё ў парадку?» — спытаў ён шэптам, нахіліўшыся вельмі блізка. А далей адбылося нешта неверагоднае. Быццам незнарок ён дакрануўся вуснамі да маіх валасоў, потым яшчэ раз і яшчэ. Вельмі асцярожна і вельмі пяшчотна... Я баялася паварухнуцца і перарваць гэты сон... Я чула, як б'ецца яго сэрца, і мне хацелася толькі аднаго — каб палёт ніколі не заканчваўся...

«Наш самалёт здзейсніў пасадку...» — данеслася з дынаміка.

— Мяне будуць сустракаць у аэрапорце, — сказаў ён стрымана. — Але я не хачу, каб усё закончылася так хутка. Пакінь мне, калі ласка, свае каардынаты — нумар тэлефона і адрас.

Я палезла ў сумачку, дастала з нататніка аркуш паперы і напісала на ім усяго адно слова: «Удачы!». Склала і засунула ў кішэню яго курткі.

— Дзякуй, — сказаў ён, правёўшы рукой па маіх валасах. — Я абавязкова патэлефаную табе.

ДАДОМУ наша група вярталася праз тыдзень — на цягніку. Я паспела ўжо атрымаць некалькі эсэмэс-паведамленняў: адно ад мужа («Вячэру разаграваць?») і тры ад Ігара Уладзіміравіча («Давай дзе-небудзь павячэраем!»). Зразумела, што з вакзала я паехала дадому — адсыпацца.

На наступны дзень мяне чакалі на працы. У сваім кабінеце я па звычцы паглядзела ў люстэрка, і тое, што ўбачыла там, мне спадабалася. Ад былога бледнага прывіду не засталося і следу. А вочы...

Вочы і цяпер выпраменьваюць святло, толькі... Кожны раз з надыходам зімы мяне ахопліваюць незразумелае хваляванне і туга. Я саджуся ў аўтобус і еду ў аэрапорт. І блукаю там, назіраючы за пасажырамі і праводзячы поглядам самалёты. Што я імкнуся знайсці? Душэўную раўнавагу? Чалавека, які перавярнуў усё маё жыццё? І што скажу яму, калі знайду? І ці змагу пасля гэтага вярнуцца дадому?

Спытайце што-небудзь больш простае, спадары...

**Наталля УЛАДЗІМІРАВА.**

# «ЗВЯЗДАРЫНАЧКА»

**Працягваецца штотыднёвая віктарына, адказы на пытанні якой, нагадаем, вы можаце дасылаць у рэдакцыю двума шляхамі: традыцыйна, праз пошту з пазнакай «Звяздарыначка» на адрас рэдакцыі (220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а) і на рэдакцыйную электронную скрыню (info@zvyazda.minsk.by). Удзельнічайце і перамагайце! Хочацца верыць, што вы ўпадабаеце гэтую новую інтэрактыўную інтэлект-рубрыку!**

**Вядучы рубрыкі Мікола ТАМАШЭВІЧ.**

## ЧАЦВЁРТЫ ТУР ВІКТАРЫНЫ

**1.** У сярэдзіне XVIII стагоддзя пабачыла свет першае перыядычнае выданне на землях ВКЛ. Аб чым ідзе гаворка?

**2.** Дзе з'явіўся і як называецца першы архітэктурны помнік стылю барока на тэрыторыі Рэчы Паспалітай і другі ў Еўропе?

**3.** Пры абароне якога горада загінуў Вячка, славуты князь Кукейнаса, які быў на пачатку XIII стагоддзя фарпостам Полацка ў Прыбалтыцы?

**4.** Хто з'яўляецца аўтарам гэтых радкоў і пра якую краіну гаворыцца ў гэтым вершы?

*«Літва! Бацькоўскі край, ты як здароўе тое:*
*Не цэнім, маючы, а страцім залатое —*
*Шкада, як і красы твае, мой родны краю.*
*Тугою па табе тут вобраз твой ствараю».*

**5.** Які востраў у Вест-Індыі належаў Вялікаму Княству Літоўскаму ў сярэдзіне XVII стагоддзя?



**6.** Як завуць аднаго з самых вядомых хакеістаў усіх часоў, які мае беларускае паходжанне і канадскае грамадзянства? Гэты гулец пабіў амаль усе рэкорды Нацыянальнай хакейнай лігі (здагадайцеся па фотаздымку).

**7.** Беларускі распрацоўшчык грамадзянскага кірылічнага шрыфту, якім цяпер карыстаюцца ўсе народы, што маюць кірыліцу, ды што доўгі час называўся «амстэрдамскія літары» альбо «беларуская азбука». Хто гэта?

**8.** Як называлася грашовая рэнта, якую на Беларусі выплачвалі сяляне феадалам пачынаючы з XV стагоддзя?

**9.** Раней гэта была школа, пазней — інстытут, а сёння — акадэмія; гэта першая ВНУ на тэрыторыі сучаснай Беларусі; з сцэнаў інстытута выйшлі многія «каліноўцы». Аб чым ідзе гаворка?

**10.** Што азначае народнае выслоўе «абое — рабое»?

**11.** Як звалі фатографа, які па даручэнні расійскага цара Мікалая II на пачатку XX стагоддзя рабіў трохкаляровыя фотаздымкі Расійскай імперыі (у тым ліку і беларускіх зямель)? Які беларускі горад адлюстраваны на здымку?



**12.** Прыблізна, колькі беларусаў пражывае за межамі Беларусі на сёння?

**13.** На якім прадпрыемстве быў створаны першы беларускі ноўтбук?




### АДКАЗЫ НА ДРУГІ ТУР ВІКТАРЫНЫ:

**1.** «Мужыцкая праўда»
**2.** Сынкавічы, Мураванка, Супрасль
**3.** Бітва на Сініх водах, 1363 (1362) год
**4.** Заходняя Дзвіна
**5.** 10. Баранавічы, Беласток, Брэст, Вілейка, Віцебск, Гомель, Магілёў, Мазыр, Мінск, Пінск.
**6.** Іван Якубоўскі, Васіль Сакалоўскі (на здымку)
**7.** Віталь Шчэрба
**8.** ~2136
**9.** Палажэнне аб стварэнні СНК
**10.** Кумяльган
**11.** Дуда
**12.** 1791 год. Землі Беларусі, Літвы і Украіны
**13.** Ігнат Дамейка

**P.S.** *З кожным турам колькасць удзельнікаў віктарыны няўхільна павялічвалася — і гэта не можа не радаваць, бо верыцца, што «Звяздарыначка» ўсё ж знайшла водгук сярод вас, нашы чытачы. Што датычыцца саміх адказаў на другі тур, дык тут мы пабачылі выдатныя веды ўдзельнікаў па большасці пытанняў. У асноўным цяжкасці ўзніклі з № 10 і № 11: былі і такія неверагодныя адказы, як Сівы Мерын, Канярыла, Палкан, Карачун, Люцыфер і г.д. Другім турам большасць балаў атрымала наша чытачка з Мінска Дар'я Каткоўская, а ў агульным заліку з невялікім адрывам лідзіруе мінулая пераможца Дар'я Вашкевіч.*

Ашмянскі мясакамбінат

# З ПАВАГАЙ ДА ЯКАСЦІ



На выстаўцы «Еўрарэгіён «Нёман-2009». Прадукцыя Ашмянскага мясакамбіната прыцягнула ўвагу намесніка старшыні камітэта па знешніх сувязях Адміністрацыі Курскай вобласці Расійскай Федэрацыі Святланы ДУРАШ.



Тэхнолаг каўбаснага цэха Ганна ЯЖЭВІЧ.



Аператар каўбаснага цэха Аляксандр МАЦЭВІЧ.



Вырабам папулярнай каўбасы «Доктарская» занята фармоўшчыца Валянціна ДАЎЛЯШЭВІЧ.

Падчас нашых сустрэч на Ашмянскім мясакамбінаце вельмі прасіла яго дырэктар Тамара Філіповіч не засяроджвацца на адных лічбах ды працэнтах. «Вы лепш раскажыце пра наш вакальна-інструментальны ансамбль. Хіба не заўважны ён, не заслугоўвае асобнага расказу? Сапраўдныя артысты, нашы ашмянскія зоркі...».

І сапраўды — вельмі хораша спяваюць хлопцы з Ашмянскага мясакамбіната. Пазнаёміліся мы з імі на той жа міжнароднай выставе ў Гродне, на якой яны спявалі для яе наведвальнікаў. І, шчыра кажучы, спачатку падумалі, што гэта быў спецыяльна запрошаны з Мінска прафесійны гурт. А як добра глядзеліся яны ў сваіх прыгожых сцэнічных касцюмах! Такім чынам, знаёмімся: галоўны бухгалтар Аляксей Філон, бухгалтар Павел Саламонаў (хто сказаў, што ў бухгалтараў адны лічбы ў галаве і ніякіх там пачуццяў), рабочыя Чэслаў Палейчык і Дзмітрый Касюдзек, галоўны спецыяліст па кіраванні якасцю Павел Лаўцэль (усіх іх можна бачыць на фотаздымку). Створана група ўсяго некалькі месяцаў таму, але ўжо паспелі спадабацца яе песні многім слухачам... Ужо на самім мясакамбінаце Аляксей Філон паказаў музычныя інструменты іх гурта.

* * *

Многа ганаровых медалёў ды дыпломаў забраў на розных выставах ды конкурсах Ашмянскі мясакамбінат. Вось і цяпер прывёз чарговы дыплом з Гродна — за ўменне рухаць сваю прадукцыю на рынкі, словам — за добры прафесіяналізм па асваенні гэтых рынкаў. Зразумела, у першую чаргу працуюць ашмянцы на свайго, айчыннага спажыўца. Напрыклад, яны маюць больш за 10 фірменных крамаў — у Мінску, Гродне, Смаргоні, у саміх Ашмянах, у Наваельні, у Шчучыне. Прычым фірменны гандаль, як падкрэсліваюць на мясакамбінаце, дае магчымасць лепш адчуваць і ўлічваць пажаданні спажыўца, а гэта, яшчэ падкрэсліваюць тут, самае важнае. Разам з тым добра замацаваўся камбінат на расійскім рынку, чаму, дарэчы, не пашкодзілі і больш жорсткія патрабаванні з боку расійскага санэпідэмнагляду; сёлета дабраліся ашмянцы са сваёй прадукцыяй не толькі да Смаленска і Масквы, але і да вельмі няблізкай Кандапогі. Што садзейнічае іх гэткай актыўнай гандлёвай экспансіі?

У першую чаргу тое, што тут не задавальняюцца дасягнутым, не стаяць на месцы. Так, на сённяшні дзень больш за 200 відаў мясакаўбаснай прадукцыі асвоілі ашмянцы, толькі адзін пералік яе, напэўна, заняў бы ці не палову гэтай публікацыі. Назавём тут што-колечы з ашмянскага асартыменту: грудзінка хутарская, каўбаскі паляўнічыя, рулька далікатэсная, флячкі з морквай (не абавязкова ездзіць цяпер у Польшчу, каб пакаштаваць гэтых самых флячкаў), каўбаса сыравяленая «Мядовая», каўбаскі сырыя з мёдам і лафантам... Аднак гэта нешта ўжо зусім новае ў рэцэптуры ашмянцаў — мёд і лафант (у прыватнасці — анісавы). Ды і ці можа спалучацца мяса з тым жа мёдам?

Як высветлілася, можа, і гэта толькі на карысць канчатковаму прадукту, дадае яму лепшага смаку. Праўда, гэта зусім не азначае таго, што мёд, так бы мовіць, трэба літаральна намазваць на тую ж каўбасу, усё добра ў разумных суадносінах. Ну, а лафант анісавы ўвогуле мае шэраг лекавых уласцівасцяў, якія не страчвае і ў тым выпадку, калі проста дадаецца да іншага прадукту. На мясакамбінаце пералічваюць гэтыя лекавыя ўласцівасці: дапамагае пры атэрасклерозе, стэнакардыі, гіпертаніі, здымае галаўны боль, ратуе ад бяссонніцы... Словам, лекавая каўбаса атрымліваецца, ды і толькі. Вы яшчэ не наважыліся накіравацца ў краму па каўбаскі з мёдам і лафантам, ці яшчэ па свініну духавую, зноў-такі з мёдам і лафантам, па смажанку «Прыма» з мёдам і лафантам і іншыя лекавыя прадукты Ашмянскага мясакамбіната, каб у выніку палепшыць сваё самаадчуванне? Калі наважыліся, падкажам карысны адрас (у прыватнасці, для мінчан) — вуліца Платонава, 10, фірменная крама «Ашмянскі пачастунак».

* * *

— Спажывец пастаянна патрабуе нечага новага, або, наадварот, жадае ўбачыць нешта ўжо даўно забытае — даводзіцца пастаянна трымаць руку на пульсе яго пажаданняў, без гэтага сёння працаваць паспяхова проста немагчыма, — гаворыць тэхнолаг каўбаснага цэха Ганна Яжэвіч. — Напрыклад, нядаўна мы запусцілі ў вытворчасць зусім новы для нас прадукт «свіныя калабкі з сырам» (вельмі зручна карміць імі маленькіх дзяцей, якія сёння нічога не жадаюць бачыць, акрамя салодкага, — і цікава, і смачна, і прыгожа), а разам з тым паставілі на паток ужо крыху забытую паўвэнджаную каўбасу «Адэскую», вараную «Маскоўскую» і некаторыя іншыя каўбасы. Іх зноў пажадаў бачыць у гандлі пакупнік. Словам, пажаданне яго Вялікасці пакупніка для нас закон.

Добрай гандлёвай экспансіі ашмянцаў садзейнічае і тое, што тут пастаянна надаюць самую пільную ўвагу пытанням якасці (нездарма на яго новым таварным знаку змешчаны кідкія словы «З павагай да якасці») і бяспекі харчовых прадуктаў. На прадпрыемстве дзейнічаюць ужо добра вядомыя міжнародная сістэма кіравання якасцю і міжнародная сістэма НАССР, якая датычыць бяспекі прадукцыі на аснове аналізу рызыкі і кантрольных крытычных кропак тэхпрацэсу. Аднак, напэўна, лепш за ўсё пра адпаведныя намаганні ашмянскіх мясаперапрацоўшчыкаў у галіне якасці сведчыць наступны факт: на прадпрыемстве не так даўно ўвялі ў строй новую вытворчую лабараторыю. Недасведчаны чытач, хутчэй за ўсё, нічога дзіўнага ў гэтым факце і не знойдзе — вытворчыя лабараторыі існуюць на прадпрыемствах паўсюдна, і дагэтуль жа існавала яна і ў Ашмянах. Але гэта было далёка не тое, што маюць ашмянцы цяпер. Трэба паглядзець, якую тут увялі новую лабараторыю. Па сутнасці, гэта сапраўдны вытворчы цэх — 400 квадратных метраў агульнай плошчы, 36 асобных памяшканняў. Лабараторыя абсталявана найноўшым кантрольна-вымяральным абсталяваннем і прыборамі, якія, дарэчы, каштуюць вельмі добрыя грошы, у ёй можна правесці амаль усе даследаванні. Як зазначаў начальнік лабараторыі Сяргей Зянкевіч, адчувальнасць многіх кантрольных прыбораў такая высокая, што для іх нармальнай работы ў лабараторыі забяспечваюць спецыяльны тэмпературна-вільготны рэжым; менавіта з забеспячэння патрэбнага рэжыму і пачынаюць у ёй працоўны дзень.

Такую лабараторыю, гэтак жа добра аснашчаную і абсталяваную, падкрэслівалі на камбінаце, мала яшчэ дзе можна знайсці. Варта тут жа асобна адзначыць: стаўленне на тым ці іншым прадпрыемстве да арганізацыі ўмоў працы падобных службаў, лабараторый, да надання ім адпаведнага статусу і магчымасцяў ужо само па сабе выразна сведчыць у цэлым аб стаўленні на гэтым прадпрыемстве да тых жа пытанняў якасці.

Асноўным клопатам супрацоўнікаў новай вытворчай лабараторыі мясакамбіната, безумоўна, стаў клопат пра кантроль мясной прадукцыі на антыбіётыкі. Прычым гэты кантроль — пастаянны, правяраецца кожная экспартная партыя.

У лабараторыі тры аддзелы — радыялагічны, мікрабіялагічны і фізіка-хімічны; аддзелы атэставаны на правядзенне адпаведных даследаванняў, працуюць у іх добрыя спецыялісты... Начальнік лабараторыі з захапленнем паказваў гэтыя аддзелы і лабараторныя памяшканні, лабараторныя прыборы, з павагай называў тыя сумы грошай, што даводзіцца выдаткоўваць на розныя хімічныя рэактывы.

* * *

На камбінаце паўсюдна адчуваюцца тыя добрыя зрухі ў яго далейшым развіцці, якія адбыліся (і адбываюцца) тут апошнім часам. Тут не так даўно ўзведзены таксама новыя халадзільныя памяшканні з захоўваннем прадукцыі на 500 тон, поўным ходам ідзе рэканструкцыя каўбаснага цэха з асобна вылучанай вытворчасцю.

— Гэта будзе аддзяленне па вырабе сыравэнджаных каўбас. Прычым гэта вытворчасць будзе поўнасцю ізаляванай ад асноўнай вытворчасці і ў выніку цалкам адпавядаць санітарна-гігіенічным патрабаванням, якія да такіх вытворчасцяў прад'яўляюцца, — казала дырэктар Ашмянскага мясакамбіната Тамара Філіповіч. — Пры гэтым мы значна павялічым свае аб'ёмы, паглыбім перапрацоўку сыравіны.

Адным словам, і далей услед за спажыўцом.

* * *

**На заключэнне.** «Ну вось, зноў пра камбінат, пра тэхпрацэс, — няйначай, скажа Тамара Уладзіміраўна Філіповіч. — А вы лепш напісалі б пра прыгажосць Ашмянскага краю, вельмі ж цудоўны ён...».

Згодны — цудоўны, і згодны з прапановай. Хіба што ўдакладнім для чытачоў: родам Тамара Уладзіміраўна з няблізкай адсюль Палтаўшчыны, украінка сама. Ды вось так бы ўсім нам любіць нашу беларускую зямлю, як любіць яе Тамара Уладзіміраўна, як любіць яна стаўшую вельмі роднай для яе Ашмяншчыну. Пра гэта ўжо нямала сведчаць яе цудоўныя фотаздымкі з цудоўнымі ж краявідамі Ашмяншчыны, якія дэманстраваліся ў многіх выставачных залах краіны.

УНП 500057139.



Інжынер-хімік вытворчай лабараторыі Аксана МАРКЕВІЧ ажыццяўляе кантроль прадукцыі з дапамогай самага сучаснага абсталявання.



На ўчастку тэрмаапрацоўкі мясных вырабаў.



Самадзейныя артысты з вакальна-інструментальнага ансамбля мясакамбіната – галоўны бухгалтар Аляксей ФІЛОН, бухгалтар Павел САЛАМОНАЎ, рабочыя Чэслаў ПАЛЕЙЧЫК і Дзмітрый КАСЮДЗЕК, галоўны спецыяліст па кіраванні якасцю Павел ЛАЎЦЭЛЬ – пакарылі сваімі песнямі ўдзельнікаў выставы «Еўрарэгіён «Нёман-2009».




«Сыр «Расійскі» мае павышаны попыт у пакупнікоў», — кажа спецыяліст па маркетынгу Наталля БАЦЯН.

Ашмянскі сыраробны завод

# ВОДАР ЗЯМЛІ АШМЯНСКАЙ...

Цудоўны сыр выпускаюць на Ашмянскім сыраробным заводзе: апетытны, духмяны. Ці то ўвабраў ён у сябе ўвесь водар лугоў і палёў прыгожай зямлі ашмянскай, ці то ўжо такія старанныя рукі ашмянскіх майстроў-сыраробаў яго прыгатавалі?.. А напэўна, увабраў ашмянскі сыр усё гэта разам. Ну безумоўна ж...

— Сыр, як тое дзіця, асаблівага догляду патрабуе; яго трэба вельмі добра папесціць, — удакладняла начальнік вытворчай лабараторыі Ашмянскага сыраробнага завода Ліля Ціхановіч. — Трэба ўважліва сачыць, каб працэс правільна пайшоў, каб сыр выспеў, як належыць. Словам, вока ды вока патрэбна. Ну вось, глядзіце, ляжыць ён на выспяванні, абгорнуты ў спецыяльную плёнку, якая прапускае праз сябе вуглякіслы газ, што падчас выспявання ўтвараецца. Калі працэс ідзе правільна, галоўкі сыру роўныя, акуратныя, а калі няправільна, пад плёнкай утвараецца не вуглякіслы газ, а аміяк, які раздзімае, успучвае гэтыя галоўкі, робіць іх падобнымі на футбольныя мячы...

— Цяпер у нас заўсёды выдатны сыр, а раней былі праблемы з вытворчасцю менавіта якаснага сыру, — дадае ўжо начальнік вытворчасці Святлана Макарэвіч. — Так было, пакуль карэнным чынам не перааснасціліся. Па сутнасці, новы завод у нас цяпер.

Аднак пакінем на час нашых гідаў па вытворчасці Ашмянскага сыраробнага завода і звернемся да выставы «Еўрарэгіён «Нёман», якая адбылася нядаўна ў Гродне. На гэтай выставе, як адзначана ўжо ва ўступе да нашай газетнай старонкі, былі прадстаўлены таксама ашмянскія прадпрыемствы, а пры гэтым і мясакамбінат з сырзаводам. І прадстаўнікам гэтых прадпрыемстваў было што паказаць. І расказаць. У прыватнасці, што датычыцца сыраробнага завода, на ім за вельмі кароткі час давялі асартымент сваіх цвёрдых сыроў (а менавіта на выпуску цвёрдых сыроў прадпрыемства і спецыялізуецца) да 20 відаў з лішкам. Іх цяпер на прадпрыемстве — на любы смак і густ. На выставе былі прадэманстраваны сыры, якіх наш спажывец у гандлі пакуль што і ўвогуле не бачыў. У прыватнасці, гэта датычыцца сыру з 20-працэнтнай тлустасцю «Фітнэс-чыз», распрацаванага разам з сумесным прадпрыемствам «Белхансен». Як ужо няблага зразумела па назве ды і па працэнтах тлустасці сыру, ён прызначаны ў першую чаргу для тых, хто, так бы мовіць, клапоціцца пра сваю фігуру. Ды яшчэ пра тое, каб не назапасіць у сябе лішняга халестэрыну.

Наведвальнікі выставы з задавальненнем паласаваліся і новымі сырамі ашмянцаў «Князь Гольша» (40 працэнтаў тлустасці), «Канталі», «Стараславянскім», «Віцязем» і іншымі. А таксама наведвальнікі настойліва пыталіся: асобныя з гэтых сыроў пакуль што адсутнічаюць на гандлёвых паліцах, калі яны з'явяцца?

— Ужо вельмі хутка, — упэўнена адказваюць на заводзе.

А яшчэ ашмянцы расказалі пра тое, чаму яны арыентуюцца на шырокі асартымент сваіх сыроў (ён, як сказана ўжо, сапраўды багаты, прычым багаты як па рэцэптурных складніках, так і па тых жа працэнтах тлустасці).

— У пакупніка заўсёды павінен быць вельмі шырокі выбар, і гэта галоўнае. Працуем жа менавіта на пакупніка, на чалавека, — падкрэсліваюць на заводзе. А разам з тым не хаваюць і больш прагматычнай мэты: гандлёвыя пункты з большай ахвотай бяруць менавіта разнастайны асартымент. І зразумела чаму: багацейшы асартымент — у цэлым лепшая рэалізацыя. Словам, на сыраробным заводзе імкнуцца як мага лепей падстроіцца менавіта пад спажыўца.



Сыр любіць пяшчотныя жаночыя рукі.

— Гэта — патрабаванне часу, — падкрэсліваюць тут. — Ну вось, напрыклад, калі на экспарт фарміруем свае 20-тонныя зборкі, у гэтых зборках прысутнічаюць практычна ўсе віды нашых сыроў — гэтай разнастайнасці просіць і патрабуе той жа гандаль.

Зрэшты, наша размова пакрысе падышла да экспартных схільнасцяў прадпрыемства. Удакладнім: больш за палову сваёй сырнай прадукцыі яно менавіта экспартуе — пераважна ў Расію, а апошнім часам наладзіла гандлёвыя сувязі таксама з Казахстанам і Украінай. На сыраробным заводзе не баяцца за якасць сваёй цяперашняй сырнай прадукцыі, не баяцца розных рэвізій з боку замежных спажыўцоў: на яе варце стаяць як руплівасць, стараннасць ашмянскіх сыраробаў, так і пасапраўднаму дзейная сістэма менеджменту якасці і сістэма па забеспячэнні харчовай бяспекі прадукцыі.

А яшчэ на варце гэтай якасці знаходзіцца сама цяперашняя высокатэхналагічная вытворчасць ашмянцаў.

* * *

Не пазнаць гэту вытворчасць цяпер. Калі, у прыватнасці, параўноўваць яе з той, якая была тут раней. А некалі тут была даволі прымітыўная вытворчасць з пераважнай доляй ручной працы. З так званым адкрытым працэсам прыгатавання сыроў, з груваcткімі ваннамі, у якіх і адбываўся гэты працэс... Цяпер амаль усю плошчу сыраробнага цэха займае аўтаматычная лінія, па якой з дакладна вызначанай хуткасцю рухаюцца формы з галоўкамі сыру (альбо ўжо вызваленыя ад яго); праз усе этапы тэхналагічнага працэсу іх праводзіць менавіта аўтаматыка; за правільнасцю працэсу сочаць спецыяльныя датчыкі, з якіх уся інфармацыя паступае ў камп'ютар, аналізуецца ім. Калі, напрыклад, салявы раствор па сваёй канцэнтрацыі стане адрознівацца ад таго, што прадугледжаны тэхналогіяй, камп'ютар спыніць лінію, пра гэты збой тут жа паведамяць сігнальныя чырвоныя лямпачкі. Пра тое, наколькі ўвесь цяперашні тэхналагічны працэс прыгатавання сыру аўтаматызаваны і камп'ютарызаваны, вельмі яскрава сведчыць такі факт: лінія падключана да internet, і пры яе пэўных збоях знешняя фірма-пастаўшчык (а гэта польская фірма «OBRAM») можа, па выказванні спецыялістаў завода, тут жа праверыць мазгі гэтай лініі, «адрэгуляваць» іх. Вядома, праз internet жа.

Да рэканструкцыі сыраробнай вытворчасці (дарэчы, рэканструкцыя працягваецца і цяпер), на ёй працавалі каля 30 чалавек, якія выпускалі за суткі каля 7 тон сыру — цяпер лінію абслугоўваюць шэсць чалавек. Увесь працэс прыгатавання сыру, як зразумела ўжо, поўнасцю закрыты (як кажуць на заводзе, ён праходзіць без удзелу рук); кругом — выключная, стэрыльная чысціня, і гэта ўжо тое, што нярэдка называюць высокай культурай вытворчасці. У сыраробны цэх нават паветра падаецца спецыяльна падрыхтаванае, г. зн. папярэдне ачышчанае ад розных прымесяў, словам, выключна чыстае. Хоць, дарэчы, Ашмяны — гэта не Мінск, а сыраробны завод знаходзіцца на ўскраіне горада і, здавалася б, што там яшчэ чысціць... А начальнік вытворчай лабараторыі Ліля Ціхановіч падкрэслівае і такую, з дазволу, дэталь: новая лінія працуе ўжо тры гады, а ўся як новенькая, нібы толькі што змантіраваная. Зразумела, не толькі тыя ж сыры патрабуюць адпаведнага догляду і клопату, але і само абсталяванне. І гэта таксама ўжо само па сабе пераходзіць на якасць сырнай прадукцыі.

— Ну вось узвядзём яшчэ новыя камеры выспявання сыру, і гэта будзе найсучаснейшае, вельмі добрае прадпрыемства, — адзначае малады дырэктар Ашмянскага сыраробнага завода Аляксандр Кавецкі. — Іншых малакаперапрацоўшчыкаў вобласці, можа, і не перагонім, але пахваляваца прымусім.

А ўжо іншыя спецыялісты завода дадаюць: «Калі наш сыр пакаштавалі, ад яго ўжо не адмаўляюцца». А яшчэ на заводзе падкрэсліваюць раскошу, чысціню ашмянскай зямлі. А гэта значыць, завод мае добрую сыравінную зону, значыць, на яго паступае добрае, сырапрыдатнае малако. А да ўсяго, яшчэ зазначаюць тут, людзі добра ставяцца да сваёй працы. Ну як пры ўсіх гэтых умовах не атрымаць добры сыр?

Застаецца пажадаць ашмянскім сыраробам: няхай спажывец і надалей будзе гэтак жа добра шанаваць іх сыр.



Майстар па доглядзе сыру Іна ГРЫШЧАНКОВА.




Начальнік вытворчай лабараторыі Ліля ЦІХАНОВІЧ.



Працэсамі фарміравання сыру кіруюць аператары Павел КЛІНЦЭВІЧ і майстар Іван ГІЛЬ.

* * *

**Каментарый галоўнага тэхнолага малочнай прамысловасці Гродзенскай вобласці Валянціны Беляковай.** За суткі да 3 тысяч тон малака перапрацоўваюць прадпрыемствы вобласці, з гэтага малака атрымліваюць 80 тон сыру, каля 80 тон сухіх малочных прадуктаў, 50—60 тон масла, каля 350 тон натуральнай малочнай прадукцыі. Усе прадпрыемствы амаль поўнасцю перааснашчаны, на іх стаіць сучаснае абсталяванне. Удзельная вага сырнай прадукцыі ашмянскага завода складае каля 15 працэнтаў у яе агульным аб'ёме ў вобласці. Апошнім часам калектыў дэманструе стабільную працу, штодня паляпшаючы свае фінансавыя паказчыкі. Пасля поўнага завяршэння рэканструкцыі, а цяпер на заводзе ідзе яе другая чарга, тут павінны павялічыць свае аб'ёмы прыкладна ў паўтара раза, давёўшы выпуск сыру за суткі да 15 тон.

УНП 500117229.

**Матэрыялы выпуску падрыхтавалі Іван БАРАНОЎСКІ, Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).**

